№ 30 (3771)

16 красавіка 2013 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

www.nv-online.info

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!

Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Да 28 красавіка можна працягнуць падпіску на «Народную Волю» на май і чэрвень. Вас чакаюць на пошце і ў спецыялізаваных пунктах «Белсаюздруку».

ОФИЦИАЛЬНО



Расселение белорусов по регионам

Всего: 9 миллионов 464 тысячи

Минск	1 миллион 901 тысяча
Гомельская область	1 миллион 428 тысяч
Минская область	1 миллион 402 тысячи
Брестская область	1 миллион 390 тысяч
Витебская область	1 миллион 208 тысяч
Могилевская область	1 миллион 76 тысяч
Гродненская область	1 миллион 58 тысяч

По данным Белстата на начало 2013 года.

НАДВОР'Е

Сіноптыкі абяцаюць вясну

Цёплае сонечнае надвор'е прагназуецца ў Беларусі на гэтым тыдні. Пра гэта паведаміў на відэабрыфінгу начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра **Дзмітрый Рабаў.**

Па яго словах, цёплае надвор'е на гэтым тыдні будзе фарміраваць Азоўскі антыцыклон.

У аўторак, 16 красавіка, у краіне чакаецца пераважна без ападкаў, у начныя і ранішнія гадзіны месцамі згусціцца туман. Ноччу 5 градусаў цяпла, днём пацяплее да 11—17 градусаў вышэй нуля.

У сераду, 17 красавіка, ападкаў на большай частцы краіны не чакаецца. Толькі днём па захадзе Віцебскай вобласці могуць прайсці кароткачасовыя дажджы, ноччу і раніцай месцамі згусціцца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—8 градусаў са знакам плюс, днём — ад плюс 15 да плюс 21 градуса.

У чацвер, 18 красавіка, па рэспубліцы чакаецца пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы плюс 3—9 градусаў, днём ад 16 да 22 градусаў са знакам плюс.

"У пятніцу, 19 красавіка, з паўночнага захаду Еўропы на тэрыторыю Беларусі пачне перамяшчацца халодны атмасферны фронт, але ён малаактыўны і зменіць надвор'е нязначна", — распавёў Дзмітрый Рабаў.

ПЕРАМОГА!


Недарма адсядзеў...



Скульптар Генік Лойка дабіўся, каб у гімназіі №4, дзе вучыцца яго сын Любарт, выкладанне ўсіх прадметаў (за выключэннем рускай літаратуры і рускай мовы), а таксама звароты настаўнікаў да вучняў падчас урокаў адбываліся выключна па-беларуску. Праўда, дзеля гэтага бацьку гімназіста давялося зладзіць так званы несанкцыянаваны пікет, адбыць за гэта 5 сутак арышту, а потым сабраць подпісы 32 бацькоў навучэнцаў гімназіі.

Нагадаем, што перформанс Генік Лойка ладзіў 21 лютага ў Дзень роднай мовы. Ён прастаяў каля гадзіны перад пачаткам заняткаў з плакатам "Віншую з Днём роднай мовы!". Гімназія №4 была апошняй з беларускай мовай навучання". Мастак паведаміў, што больш за ўсё яго абурыла тое, што ў статут гімназіі ўнеслі папраўкі, якія далі магчымасць настаўнікам весці выкладанне прадметаў на рускай мове. Генік Лойка патлумачыў, што калі ён аддаваў у гімназію свайго сына, то разлічваў на тое, што навучанне будзе весціся па-беларуску выключна па ўсіх прадметах. Намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Алена Мікалайчык абвінаваціла Лойку ў незаконнай акцыі і запатрабавала, каб той сышоў. Нават ужо пасля таго, як Генік Лойка адбыў арышт, яна настойвала, што ў гімназіі можна выкладаць як па-беларуску, так і па-руску.

Пасля звароту бацькоў гімназістаў упраўленне адукацыі Фрунзенскага выканаўчага камітэта г.Мінска дало такі адказ *(дакумент скаініраваны з пэўнымі хібамі. —* **Рэд.***):*



АДМІНІСТРАЦЫЯ ФРУНЗЕНСКАГА РАЁНА г. МІНСКА

УПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ

АДМИНИСТРАЦИЯ ФРУНЗЕНСКОГО РАЙОНА г. МИНСКА

УПРАВЛЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ

Бацькам навучэнцаў
ДУА "Гімназіі № 4 г.Мінска"
г. Мінск,
вул. Скрыпнікава, 25-23

Аб разглядзе звароту

Паважаныя бацькі!

Упраўленне адукацыі адміністрацыі Фрунзенскага раёна г.Мінска разгледзела Ваш зварот на імя дырэктара ДУА "Гімназія № 4 г.Мінска" Бандарэнка Ю.М. паведамляе наступнае:

У апошняй рэдакцыі Статута ДУА "Гімназія № 4 г.Мінска" ад 06.08.2012 г., рэгістрацыйны нумар 190891849 пункты "3.2. Асноўнымі мовамі навучання і выхавання ва ўстанове з'яўляецца беларуская і руская" і "3.32. Асноўная мова навучання і выхавання – беларуская" – некарэктныя і ўзаемна супярэчлівыя.

У сувязі з гэтым упраўленне адукацыі ўказала адміністрацыі ДУА "Гімназія № 4 г.Мінска" на неабходнасць у тэрмін да 15.04.2013 г. звярнуцца ў камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама з хадайніцтвам унесці ў Статут гімназіі наступныя змены: пункт 3.2. раздзела 3 зацвердзіць у наступнай рэдакцыі: "Асноўнай мовай навучання і выхавання ва ўстанове з'яўляецца беларуская мова", пункт 3.32. раздзела 3 скасаваць.

Таксама адміністрацыі ДУА "Гімназія № 4 г.Мінска" прапанавана як найхутчэй абнавіць інфармацыю на афіцыйнай інтэрнэт-старонцы згодна з прынятымі па Статуце зменамі.

Згодна з арт.20 п.1 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб" Вы маеце права абскардзіць дадзены адказ у вышэйстаячай арганізацыі.

Начальнік упраўлення адукацыі І.А.Чарняўская

Генік Лойка задаволены вынікам сваёй работы. Праўда, ён разлічвае, што міліцыянеры вернуць яму шыльду, якую ён зрабіў адмыслова для перформанса.

"Народная Воля" пацікавілася, ці складана было ініцыятыўнаму мастаку сабраць подпісы іншых бацькоў гімназіі.

— Я быў упэўнены, што падпішуцца чалавекі тры. Але тых, хто асмеліўся падпісаць зварот, аказалася амаль у 10 разоў больш. Я бачыў, як многія вагаліся — баяліся праблем на працы для сябе ці для дзяцей, якія навучаюцца ў гімназіі.

У кабінет дырэктара гімназіі з намі пайшоў і Генадзь Бураўкін. Пытанне вырашылася на карысць беларускай мовы без усялякіх праблем. Дарэчы, дырэктар сказаў, што і не трэба было подпісы збіраць, можна было ўсё вырашыць, патлумачыўшы сутнасць прэтэнзій. А ў мяне ж былі жорсткія спрэчкі з намеснікамі дырэктара...

Любоў ЛУНЁВА.



SOS!

Больше миллиона белорусских женщин подвергаются домашнему насилию

Такую цифру озвучил начальник управления профилактики Главного управления охраны правопорядка и профилактики МВД ***Олег Каразей****.*

Причем поколачивают жен не только безработные и алкоголики, но и военные, госслужащие и даже сотрудники правоохранительных органов!

Нож в горло

Эта история случилась позавчера в Мозыре. Во время семейной ссоры муж ударил жену по лицу, а она, видимо, защищаясь, схватила нож и в ответ ударила его ножом. Попала в шею. От полученного ранения мужчина умер на месте. Возбуждено уголовное дело по статье "Убийство". У пары двое маленьких детей. Какое их ждет будущее — никто не знает...

"Судя по сводкам за эти выходные, тяжкие телесные повреждения причиняли именно женщины, хотя по статистике 86% преступлений в быту совершают мужчины, — говорит Олег Каразей. — *При этом каждое третье убийство и умышленное причинение тяжких телесных повреждений — за женщиной".*

Не исключено, что этого убийства в Мозыре могло и не быть. Если бы на эту семью вовремя обратил внимание или участковый, или соседи.

"*Пострадавший привлекался к административной ответственности в 2009 году за появление в пьяном виде в общественном месте*, — говорит Каразей. — *В настоящее время он вообще считается не привлекавшимся. И за последние годы заявлений о том, что в этой семье возникают конфликты, в милицию не поступало. Сейчас будет вестись проверка, выяснится, нет ли на самом деле в этом случае нашей недоработки. Другое дело, если скандалы в этой семьей были, но муж и жена не выносили сор из избы. Тогда соседи могли сообщить. Поэтому мы всегда говорим: если слышите за стеной крики — позвоните в милицию, у нас эта информация будет зафиксирована. И мы будем обращать внимание на такие семьи..."*

Без скандалов скучно жить?

Только в 11—13% семей супруги решают возникающие проблемы без ссор и скандалов. Более чем в половине семей выяснение отношений происходит на повышенных тонах, с бранью, взаимными оскорблениями, угрозами. А в 3% семей (по ответам мужчин) и в 6,3% (по ответам женщин) во время ссоры супруги прибегают к рукоприкладству.

Такие данные в конце минувшего года обнародовал Центр социологических и политических исследований БГУ, анализируя ситуацию с домашним насилием в Брестской области.

Так, различные виды и формы насилия испытывали по отношению к себе 82,4% женщин и 70,9% мужчин. Психологическое насилие — 82,1% женщин и 69,7% мужчин, физическое — 32,8% женщин и 19,6% мужчин, сексуальное насилие со стороны мужа/партнера — 17,6% женщин. Все виды насилия пережили 10,2% женщин и 3,3% мужчин. В наибольшей степени подвергались ранее всем видам насилия женщины, находящиеся теперь в разводе. Причем каждая десятая (10,9%) подвергалась физическому насилию во время беременности.

"С учетом того, что Брестская область, в соответствии с данными уголовной статистики, является регионом с невысоким уровнем бытовой преступности, эти данные можно смело применить ко всей Беларуси, — комментирует цифры **Олег Каразей**. — *Даже если взять только физическое насилие, то получается, что речь идет минимум о миллионе женщин..."*

(Окончание на 3-й стр.)

ДАРЭЧЫ

«Адзінага» не будзе

"Адзінага кандыдата ад дэмакратычных сіл на прэзідэнцкіх выбарах, якія павінны адбыцца ў 2015 годзе, не будзе", — такую заяву зрабіў лідар Партыі БНФ Аляксей Янукевіч, выступаючы на пасяджэнні партыйнага сойму.

Ён сказаў, што перамовы, у якіх удзельнічаюць АГП, Партыя БНФ, "Справядлівы свет", сацыял-дэмакраты Ірыны Вештард і дагэтуль не зарэгістраваная партыя БХД, а таксама рух "За свабоду" і грамадзянская кампанія "Гавары праўду!", не даюць падстаў для абрання адзінага кандыдата.

Старшыня Партыі БНФ таксама заявіў, што *"адзіны кандыдат не з'яўляецца самамэтай".*

Нагадаем, што шматлікімі калонамі апазіцыя на выбары ўжо хадзіла не аднойчы. І што?

АКЦЫІ

«Зялёныя» прапануюць рэфармаваць «Чарнобыльскі Шлях»

Каб вярнуць мерапрыемству масавасць, яго прапануюць пазбавіць палітызаванасці і зрабіць цалкам экалагічным.

Менавіта відавочная палітызаванасць і апазіцыйнасць, нягледзячы на экалагічны лозунг "Не — АЭС!", адштурхоўвае ад "Чарнобыльскага Шляху" людзей, упэўнены старшыня Беларускай партыі "Зялёныя" **Алег Новікаў:**

"Калі чытаеш пасланне, то відавочна, што гэта апазіцыйная акцыя. Я не супраць, але спрабую глядзець на гэта вачыма абывацеля. А той гэта ўспрымае найперш як апазіцыйную акцыю і толькі потым — як экалагічную. Мы хочам пераставіць акцэнты: каб на першым месцы была экалогія, а на другім — палітыка".

Цікава, а што вы думаеце наконт гэтай ініцыятывы?

ПАЛІТКУХНЯ

Выбараў няма. Але Партыя БНФ будзе ў іх удзельнічаць

Сойм Партыі БНФ прыняў рашэнне аб удзеле ў мясцовых выбарах. Функцыі штаба па падрыхтоўцы да іх ускладзены на ўправу партыі, якая павінна распрацаваць план паўнавартаснага ўдзелу ў выбарах.

Пытанне фармату ўдзелу ў выбарах было асноўным пытаннем сойму, які прайшоў у Мінску ў мінулыя выхадныя. Вырашана ўдзел у гэтай кампаніі разглядаць у звязку з прэзідэнцкай выбарчай кампаніяй 2015 года.

— Усе сябры сойму, усе выступоўцы пагадзіліся з тым, што ігнараваць гэтую падзею нельга, — расказаў кіраўнік гродзенскіх партыйцаў Вадзім Саранчукоў. — *Мы сыходзім з таго, што гэтыя выбары стануць яшчэ адным этапам для падрыхтоўкі кампаніі 2015 года, для таго каб можна было сапраўды аб'яднаць дэмакратычныя апазіцыйныя сілы і ў тым ліку праз увасабленне нейкай персанальнай альтэрнатывы на месцах. Гэтым будзем займацца падчас выбараў у мясцовыя Саветы.*

"У той жа час трэба разумець, што сапраўдных выбараў у сённяшняй Беларусі — свабодных, справядлівых, з сумленным падлікам галасоў — не існуе. Тым не менш удзельнічаць у выбарчай кампаніі, у легальнай палітычнай барацьбе, працы з насельніцтвам неабходна. І асабіста я буду ўдзельнічаць у гэтай кампаніі", — кажа Вадзім Саранчукоў.

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

Посол не подтвердил. Но и не опроверг

Посол Венесуэлы Америко Диас Нуньес на пресс-конференции в Минске 15 апреля не подтвердил, но и не опроверг информацию о том, что Беларусь задолжала Венесуэле за нефть 2,8 миллиарда долларов.

Дипломат заявил: *"Мы — серьезные партнеры, и не может быть места для предположений о возможной задолженности. То, что не озвучено на официальном уровне, не имеет смысла комментировать. Что касается задолженностей как таковых, то это обычный процесс, когда один или оба из партнеров не вовремя оплачивают какую-то продукцию. Все это будет обсуждаться на заседании комиссии".*

Белорусская сторона сведения о долге перед Венесуэлой также официально не комментировала.

ОСОБЫЙ ВЗГЛЯД

Как белорусам прийти к переменам

Авторитаризм, используя государственную идеологию, подчиненные средства массовой информации, подавляя инакомыслие, всегда будет принимать решения в пользу единственного варианта — максимально долго продлить полномочия действующего президента.

Демократия же призвана принимать решения в пользу общества, граждан страны — от сельсовета до столицы. При ней широко используются опросы общественного мнения, общественные слушания, местные референдумы, результаты которых являются основой для принятия решений.

Роль общественного контроля при демократии выполняют независимые суды, свободная пресса. Свободные и прозрачные выборы — при демократии — позволяют оперативно вносить корректировки в состав властей.

Самый страшный позор для общества — бездействие в период, когда диктатура, становится реальной угрозой. Безразличие, ложный страх, неспособность объединиться и дать отпор могут привести к трагедии.

На протяжении двух последних десятков лет власть где кнутом, а где пряником вела и продолжает вести политику, направленную на самосохранение.

Оппозиция взяла на вооружение "стратегию ожидания": как только речь заходит о выборах, она ждет от власти изменений в избирательном законодательстве, позволяющих провести выборы открыто, демократично. Но проблема заключается в том, что эта власть никогда не внесет таких изменений.

Образовался замкнутый круг, очень выгодный власти, потому что все зависит только от нее, а она ж не дура идти на самоликвидацию. Разорвать порочный круг, выйти из стопора — вот задача оппозиции, если она хочет движения вперед.

К сожалению, оппозиция не предлагает собственную стратегию, появление которой объединило бы ее, а обслуживает стратегию оппонента и, раздираемая противоречиями, все больше погружается в междоусобицы. Она действует разрозненно. И выработать и реализовать идею мирного пути выхода страны из сложившейся ситуации не в состоянии.

Мирный путь — это путь диалога. А в диалоге важно равноправие сторон, которого у оппозиции нет.

Задача номер один для оппозиции — отвоевать равные права в диалоге с властью.

Я предлагаю неординарную, не применявшуюся ранее стратегию, которая объединит политически активных, демократически настроенных граждан и созревших к переменам представителей сложившейся в нашей стране вертикали.

Во-первых, давайте по-новому посмотрим на значение и проведение местных выборов.

Сформировавшееся негативное отношение к низовым выборам определяется плачевным состоянием и доселе неказистой, а по сути предательской линией поведения национальной оппозиции.

Определенной части "номенклатурной" оппозиции, которая уже давно привыкла стричь купоны, никогда не был важен результат. Отрицательный результат на выборах многих таких оппозиционеров устраивает даже больше, чем победа. В случае победы ведь придется реально работать, брать на себя ответственность. А оно им надо?

Вся надежда на так называемую массовку, которая присутствует в белорусских оппозиционных политических партиях и которая, в большинстве случаев используется втемную. Основной же груз в такой ситуации ложится на плечи той малочисленной прослойки "идейных", которые, к счастью, еще остались в партиях. На них основная ставка. Когда "идейные" всколыхнут массовку — общими усилиями они приведут в соответствие свое внутреннее партийное состояние.

Думаю, им по силам установить принципы демократии в собственных партиях, прежде чем предлагать эти принципы обществу в масштабах всей страны.

(Окончание на 2-й стр.)

ОСОБЫЙ ВЗГЛЯД

Как белорусам прийти к переменам

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Такой путь осознания и самоочищения предстоит белорусским оппозиционным партиям.

Выборы в местные Советы. Как можно и нужно их провести?

В Беларуси 6 областей. В каждой по 50 депутатов областного Совета. Умножаем 6 на 50 и получаем 300 избирательных округов в областные Советы депутатов.

Для примера возьмем небольшой район, территория которого составляет один избирательный округ в областной Совет. В этом же районе будут избираться 35 депутатов районного Совета. В этом же районе есть 6 сельских Советов по 15 депутатов в каждом — 90 депутатов.

Получается вертикаль из 126 человек. Наверху ее — кандидат в областной Совет. Он оппонент власти. Как ему победить?

Ему нужна сплоченная команда единомышленников, профессионалов. Где взять?

Но ведь этот человек не вчера родился и не вчера принял решение участвовать в выборах. Он готовился. Всю жизнь или большую часть жизни он прожил в этом районе. Исколесил его вдоль и поперек. Он знает людей. Кто чем дышит, кто чего стоит. Уже давно прикинул, кто мог бы стать хорошим кандидатом в районный Совет и, став депутатом, был бы отличным представителем интересов людей. Он просчитывал, прикидывал, кого можно было бы предложить на пост председателя райсовета, кто из земляков был бы отличным председателеми того или иного сельского Совета. Думаю, такие люди в масштабах каждого избирательного округа в областной Совет депутатов очень быстро обнаружатся после опубликования этой статьи.

В районе создается костяк (хребет альтернативной вертикали), который состоит из сторонников перемен — людей, оппозиционно настроенных, активистов, неформальных лидеров общественного мнения. Этот костяк очень быстро заполнит все вакансии в списке претендентов на кандидатов в депутаты своего избирательного округа. Ведь наш предполагаемый претендент на пост председателя сельсовета лучше кого бы то ни было знает, кому можно предложить избраться депутатом сельского Совета, кто не сдрейфит, кто умеет идти до конца и кто, в случае избрания, проголосует за него, когда придет время выбирать председателя сельсовета.

Нужно отметить, что особо бронебойные претенденты будут нужны в качестве кандидатов в городские Советы депутатов, особенно в столичный!

У власти будет своя вертикаль, у оппозиции — своя.

Напротив одной системы встанет другая.

Мы рассматриваем пример небольшого района. В крупном районе возникнут две или три вертикали, в Беларуси — 300 независимых вертикалей.

Эти вертикали будут нуждаться в теории и мотивации. Люди, которые приняли непростое решение быть в составе такой вертикали, должны иметь защиту.

И вот с этого момента возникает необходимость налаживания горизонтальных связей между вертикалями. Когда эти связи установятся, любой вертикальщик, любой спецслужбист тысячу раз подумает, прежде чем зацепить кого-то из сторонников перемен.

Всем кандидатам, всем избирателям необходимо объявить о той "генеральной схеме", которую мы избрали на период избирательной кампании в местные Советы депутатов, и убедить в ее реалистичности. Объяснить, что от личной позиции каждого зависит общий успех.

Платформа объединения проста и понятна. Все несогласные едины в одном — они хотят иметь возможность принимать участие в обсуждении всех проблем, касающихся их самих, их семей, их предприятия, района, страны. Они хотят присутствовать во время принятия решений по этим вопросам, хотят, чтобы их голос учитывался и влиял на эти решения, чтобы результаты голосований не фальсифицировались в пользу авторитарной системы.

Представим, что такая возможность у нас есть. Готовы ли мы реализовать ее? Понадобятся ведь способности. Есть ли у нас подготовленные люди, способные взять в свои руки вопросы самоуправления на местах? Нет, нет и нет. Нужно заниматься подготовкой и теоретической, и практической. Есть, конечно, и люди подготовленные и уже давно способные. Почему же даже они не имеют желания принимать участие в местных выборах? А все потому, что объективно в любой сфере нашей с вами жизни действует закон диалектики — переход количественных изменений в качественные. Согласно ему, судьба авторитарного режима зависит в том числе и от наших с вами действий, от того, какие планы по его преодолению мы будем утверждать, какое количество людей их будет выполнять, как мы будем верить в победу, какую защиту для себя и своих сторонников применим.

Мы накрываем всю Беларусь своими кандидатами, готовим их теоретически, объясняем им все то, что описано выше (мотивируем). Руки у власти коротки. Одно дело — справиться с единственным несогласным в районе, другое — когда их полторы сотни. Избиратели увидят, что против одной силы, уже изрядно надоевшей, встала другая. Возникла система, призванная похоронить прежнюю. Осознание того, что это сделать необходимо, будет непреодолимым. Осознанная необходимость — это сила, которая все время возмущается, не дает жить спокойно, толкает на действия. Результаты выборов будут совершенно непохожими на все предыдущие.

Но! Прежде мы научим представителей образовавшихся вертикалей тому, как правильно выдвигаться, чтобы у избирательных комиссий не было законных оснований их не зарегистрировать, научим, как правильно агитировать, как готовить и выдвигать неподкупных членов избирательных комиссий и как добиться того, чтобы они были включены в состав комиссий и т. д. и т. п.

Мы расскажем о практике самоуправления в других странах. О полномочиях депутатов в этих странах. Дадим все раскладки и подробности, сходства и отличия...

Мы поговорим о Белорусской национальной идее.

Миссия — это то, как меняется мир вокруг тебя. Миссия каждого, кто понял и принял идею, которая изложена в этой статье, донести эту идею до максимального количества людей.

Задача проста: предложить людям такой сценарий. Не навязывать его. Не пытаться насильственно осчастливить, а предоставить выбор. Готовы к изменениям — вперед. Готовы и дальше терпеть — назад.

Такая стратегия поведения на местах позволит по-иному вести себя и потенциальным кандидатам, и членам избирательных комиссий, и избирателям.

На первый взгляд предлагаемая стратегия кажется невероятной (нереальной), крамольной. Но! Во-первых, кто стучит, тому открывают, — так говорят мудрые люди. А во-вторых, в предложенной стратегии нет даже сотой доли процента чего-то противозаконного. Все предлагаемые действия находятся в рамках конституционного поля. Более того, как мне кажется, к лагерю сторонников перемен с каждым новым днем готовы примкнуть все новые и новые группы населения в нашей стране.

Нужно отметить, что в авангарде нашей стратегии не смогут стать люди, которые уже 20 лет гордо называют себя белорусскими оппозиционерами. Поначалу они будут сомневаться, подозревать. Они будут самыми большими скептиками всего нового, жизнеутверждающего, найдут тысячу отговорок и аргументов "против" и ни одного "за". И это легко объяснить — ведь речь идет о безумно уставших людях. Они устали от борьбы, которая на всем своем протяжении была проигрышной. Имея 20-летний опыт лишь поражений, трудно оставаться оптимистом.

Некоторым оппозиционным деятелям, оказывается, недостаточно мотивации для того, чтобы участвовать в местных выборах. Добрую половину своей сознательной жизни они стремились построить демократию в своей стране, а сейчас, когда нужно поработать с людьми (получить 6 мандатов из 11 в свой родной поселковый Совет) и стать председателем поселкового Совета, чтобы не на словах, а на деле внедрять и продвигать эту самую демократию, учиться самоуправлению, — это оказалось для них низко, мелко и т.д. Им сразу портфели министров и помощников президента подавай. Ребята, встряхнитесь от спячки, возвратитесь в адекват — не ступив на подножие горы, на вершину не поднимешься.

Завершится избирательная кампания. В одном сельсовете изберется один депутат из нашей вертикали, в другом — шесть депутатов из одиннадцати, и мы изберем своего председателя сельсовета. В каком-то районном Совете окажутся 5—10—20 наших депутатов, кто-то станет областным депутатом. Мы создадим "Белорусскую ассоциацию депутатов местных СОВЕТОВ ДЕПУТАТОВ". С этого момента мы станем системой в системе. Мы сможем консолидированно выступать прежде всего за расширение своих полномочий. Мы сможем реально работать с населением, проводить опросы общественного мнения, назначать и проводить местные референдумы, по-иному проводить президентские и парламентские выборы. Мы сможем развивать и расширять свою систему.

Фундамент, созданный на местных выборах, изменит расклад сил, позволит на равных вести диалог с властью по всем вопросам, станет платформой, которая неизбежно приведет к общей победе.

Революция в сознании людей — вот мирный путь нашей страны

Нам не нужны ни великие потрясения, ни великая Беларусь. Мы не Россия. У нас нет имперских амбиций. Мы хотим быть обычной европейской страной, в равной степени уважающей и взаимодействующей со своими соседями. Однобокость, кособокость — угроза нашему суверенитету.

По сути, для начала реализации предложенной стратегии требуется 300 отважных мужчин и женщин (см. аналогию со спартанцами), которые будут взаимодействовать с людьми в своих регионах и найдут по 150 вменяемых, неравнодушных, достойных граждан своей страны, которые не хотят мириться с тем, что за них все решают, все считают, вводят или отменяют, строят или разрушают.

Недостающую теорию и мотивацию этим людям даст учеба по самоуправлению. Эти люди узнают, какими правами, возможностями они могли бы обладать, если бы у нас был не авторитаризм, а демократия. Они заболеют этим, ощутят, осознают каждой клеткой своего тела необходимость перемен. Эта осознанная необходимость не даст больше спокойно жить, пока не будут достигнуты изменения.

Вот такой план действий предлагается. Такая стратегия. Победоносная ли она?

Нам нужна та самая солидарность, которая в свое время привела поляков к триумфальной победе. Но то, что нам надо, — это ежедневный тяжелый труд.

В 1985 году поляки использовали свой шанс. Слово за белорусами.

В заключение не могу не процитировать стихотворение нашего белорусского классика Нила Гилевича, адресованное белорусам:

Што дрыпаеш гэтак дробна на падагнутых нагах?
Роўна хадзі, брат, роўна! І кроку прыдай размах!
Шырока ступай і цвёрда! Паставу ў хадзе зьмяні!
Годна трымайся і горда! Ты — на сваёй зямлі.

Што ты пагляд панылы пад ногі ўпіраеш, у дол?
Што: табе — край нямілы? Родны прастор наўкол?
Смела, а не як злодзей, на свет і людзей зірні!
Годзе трымцець, брат, годзе! Ты — на сваёй зямлі.

Што ты ўсё шэптам, шэптам ды і на вуха яшчэ,
Нібы махляр з гешэфтам:
крый Бог — сакрэт "працячэ".
Прэч адкінь гэту боязь! І праўду перад людзьмі
Кажы, брат, на поўны голас! Ты — на сваёй зямлі.

Виктор Алексеевич КРИВАЛЬ.

г.Узда

ОБ АВТОРЕ

КРИВАЛЬ Виктор Алексеевич



Родился 11.01.1966 г. в городе Ивацевичи Брестской области.

1983—1988 гг. — Белорусская с/х академия.

1991—1995 гг. — депутат Любячского с/с.

2003—2007 гг. — депутат Узденского райсовета.

Индивидуальный предприниматель.

С 2000 г. член БСДП (Громада).

Живет в Узде.

РЭГІЁНЫ

Згарэў чалавек

Пасля начнога пажару на вуліцы Смірнова ў Брэсце знойдзена цела моцна абгарэлага чалавека.

Калі выратавальнікі прыбылі па выкліку, яны не думалі, што полымя ўжо ахапіла ўвесь прыватны дом. Неўзабаве абваліліся перакрыцці. Ці маглі знаходзіцца ў памяшканні людзі, спецыялісты не ведалі.

Агонь знішчыў дах, перакрыцце, маёмасць, пашкодзіў сцены. Пры разборы завалаў прадстаўнікі газадымаахоўнай службы знайшлі цела загінуўшага чалавека. Цела так моцна пашкодзіў агонь, што пол і асобу ахвяры візуальна вызначыць проста немагчыма.

Паводле інфармацыі абласнога ўпраўлення МНС, дом жылы, аднапавярховы, драўляны, належаў мужчыне 1972 года нараджэння. Прычына пажару высвятляецца.

Дом на беразе ракі ў Брэсце пайшоў расколінамі

Касыя расколіны ад 12-га да першага паверха пайшлі па паўночнай апорнай сцяне дома па Набярэжнай Францыска Скарыны, 32 у Брэсце.

Расколіны з'явіліся не толькі на фасадзе дома. Яны добра заўважны і ўнутры кватэр. А вось плітка, якой абліцаваны дом, патрэскалася ад першага паверха да апошняга.

На набярэжнай ракі Мухавец тры падобныя 12-павярхоўкі. Яны ўзведзены па чэшскім праекце напрыканцы 70-х — пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя. Разам дамы складаюць ансамбль пры ўездзе ў цэнтр Брэста з боку Варшавы.

Праблема гэтых будынкаў у тым, што кожны з іх сваім заходнім крылом абапіраецца на тры масіўныя бетонныя калоны. Дом, які даў расколіну, пабудаваны на пачатку 80-х і нядаўна (у 2005 годзе) быў прызнаны аварыйным.

Марыя МАЛЕВІЧ.

ГУЧНАЯ СПРАВА

Аўтуховіч хоча падаць на Аліхвера ў суд

Вестка пра тое, што былы следчы ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў Мікалай Аліхвер, які давёў да суда першую справу Мікалая Аўтуховіча, нарэшце дайшла і да гродзенскай турмы, дзе Мікалай зараз адбывае пакаранне.

Нагадаем, што першая справа супраць Аўтуховіча была заведзена пасля таго, як Мікалай пачаў абнародаваць звесткі аб карупцыі ў органах улады ў Ваўкавыскім раёне. Пазней стала вядома, што следчы Аліхвер раптоўна звольніўся з ДФР і з'ехаў з Беларусі. Праходзіла інфармацыя, што ён з'ехаў ў ЗША па выйгранай Green Card.

Пасля вызвалення па першай крымінальнай справе Мікалай Аўтуховіч быў на прыёме ў амбасадара ЗША ў Беларусі Карэн Сцюарт. Палітвязень прасіў удакладніць, ці спраўды следчы эміграваў у ЗША. Амбасадар абяцала дапамагчы з інфармацыяй, аднак да нядаўняга часу пацвярджэння гэтаму не было.

Аднак рэжысёр Вольга Нікалайчык распаўсюдзіла інфармацыю ў сацыяльных сетках, што Мікалай Аліхвер разам з сям'ёй пражывае ў штаце Атланта, ЗША.

"На фота гэта ён, я бачыў у газеце здымак з яго старонкі ў інтэрнэце, — пацвярджае ў лісце Мікалай Аўтуховіч. — *А наконт таго, што будзе далей з ім, адкажу: калі не распавядзе, як усё было, звярнуся ў суд, доказаў хапае. Магчыма, гэта зробіць мой адвакат".*

СІТУАЦЫЯ

Вайна за соткі,

альбо Як праводзілася "спецаперацыя" па ліквідацыі прыватнай цяпліцы шматдзетнай сям'і ў вёсцы Вялікае Малешава на Століншчыне...

Пачалася яна, можна сказаць, класічна — у чатыры гадзіны раніцы... Красавіцкі досвітак не чэрвеньскі: цемень — хоць вока выкалі... Пад пакрывам ночкі ва ўрочышча Рублёўскае (аселіца вёскі Вялікае Малешава) падкацілі два грузавікі, набітыя міліцыянтамі, ды яшчэ адзін з супрацоўнікамі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Не бавячы дарма час, службоўцы кінуліся выконваць загад начальства — раскідваць цяпліцу спадарыні Краўцовай...



Вялікамалешаўцы хоць і працавіты, упраўны народ, але ж не настолькі, каб сярод ночы шчыраваць у тых цяпліцах — праспалі, карацей... А сёмай гадзіне вестка пра "аблаву" дакацілася да людзей: кінуліся ратаваць краўцоўскую халабуду, але дзе там — нападнікаў і след прастыў. Адно пабачылі — голы цяплічны дах ды вывернутыя слупы, зваленыя ў кучу. Павохкалі, паразводзілі рукамі, паспачувалі гаспадарам і сталі разыходзіцца. Што тут скажаш: гарбяда для шматдзетнай сям'і, але ж "начное ліха" можа абрынуцца і на іншых. Мясцовая ўлада такім макарам, значыцца, вырашыла навесці парадак у зямельным пытанні... Хай бы і так, але ж не ўвесну — калі расада падышла і ўжо час парадкаваць яе ў цяпліцы. Чаму не сталі праводзіць сваю "рэформу" з восені, а як ужо закапаны слупы, накрытыя дахі?.. Цяпер, каб і хацеў перанесці цяпліцу ў іншае месца, то запозна: веснавое разводдзе, гразка, вады па калена — не падступішся... Па вяртанні з поля раз'юшаныя месцічы сталі тэлефанаваць у Мінск — у рэдакцыю "Народнай Волі". Так і так, маўляў, поўнае дзікунства: як не дасцё рады, то хоць раскажыце людзям, што ў нас тут творыцца... Тэлефанавалі непасрэдна мне, паколькі днямі асабіста прысутнічаў на вясковым сходзе ў Альшанах, дзе і разглядалася (апроч усяго іншага) самае набалелае для месцічаў — зямельнае — пытанне. А 9 красавіка ў газеце з'явіўся ўжо і мой артыкул пад назвай "А дзе ж той выхад? Дзе збавенне...". Каб чытачу было ўцямна, што да чаго, выкажу фабулу напісанага: у дзвюх вёсках — Альшанах і Вялікім Малешаве — амаль дзесяць тысяч жыхароў. І практычна ўсе займаюцца вырошчваннем гародніны — пераважна агуркоў. З таго і жывуць, прычым няблага. Але во праблема: народу ў вёсках прыбаўляецца (што ні сям'я, то шматдзетная), і зямелькі на ўсіх перастала хапаць. Грамадскі сектар (СВК) сітуацыю ніяк не выратоўвае, бо ў былым калгасе занята толькі 200 чалавек. Раённае начальства гарою за той СВК, але што рабіць тым, хто фактычна беспрацоўны? На сходзе адзін такі шматдзетнік устаў ды і выдаў старшыні райвыканкама Пратасавіцкаму тое, што ўжо зрабілася болем для ўсіх. *"Вось вы стаіце на абароне грамадскага сектара, — казаў ён, — а я вам задаю прамое пытанне: ці ведаеце вы, колькі працаздольнага насельніцтва ў нашым Вялікім Малешаве? 970 чалавек. А колькі працуе ў СВК? Усяго толькі 200, і вакансій — ніякіх. Адкажыце: куды падзецца 670 працаздольным мужчынам і жанчынам? Як ім жыць, з чаго?.."*



Сход той нічога істотнага ў плане землеўпарадкавання так і не вырашыў, затое "вертыкаль" — па ўсім — вырашыла дзейнічаць рашуча і бескампрамісна: ніякіх выключэнняў і паблажак — ні для шматдзетных, ні для астатніх! І вось гэты званок абураных людзей... На другім канцы тэлефоннай лініі Ганна Краўцова і Анатоль Флар'яновіч. Пачаргова задаю ім пытанні, найперш пра "міліцэйскі" рэйд:

— Ці ўпершыню такое, чаму менавіта ноччу здзейснены разбуральніцкі акт?

***Ганна Краўцова** (на фота):*

— Не, гэта ўжо другі раз... А 10 красавіка быў першы: я паехала ў Брэст, каб патрапіць на прыём да "губернатара", а мясцовая ўлада была ў курсе. Падцікавалі момант ды і прыслалі міліцыянтаў з эмэнэснікамі. Сталі тыя зносіць маю цяпліцу... Але аднавяскоўцы кінуліся ратаваць — сталі грудзьмі на абарону... Той раз аблаву ўчынілі з бензапілами, цяпер без іх. Праўда, зараз ужо пакінулі нас з носам — разбурылі і дах, і слупы павырывалі...



***Анатоль Флар'яновіч** (на фота):*

— Чаму менавіта ноччу? А ўсе брыдкія справы робяцца па начах... Мусіць, збаяліся людскога гневу, то і вырашылі схітраваць — каб ніхто не бачыў, каб усё шыта-крыта. Можаце сабе ўявіць: 30 міліцыянтаў ды яшчэ 12 ці мо 15 эмэнэснікаў... Ну проста спецаперацыя, ці як гэта назваць — нават не ведаю...

— Ганна Іванаўна, а хто першым згледзеў ды паведаміў вяскоўцам пра міліцэйскую аперацыю?

— Ды мясцовы чалавек — Мікалай Кардаш. Ён ранічкай паехаў да сваёй цяпліцы — недзе а сёмай раніцы — і ўсё ўбачыў. Пасля адзін чалавек з Жыткавічаў расказаў, што ўначы ехаў узбоч і ў святле фараў бачыў, як руйнавалі цяпліцы. Кардаш, канечне, адразу і паведаміў людзям. У палове восьмай мы кінуліся ва ўрочышча, а там ужо нікога — толькі слупы пасціданы ў кучу. На развілцы дарогі міліцыянты пакінулі адно даішны пост, то з вёскі і не прапускалі ва ўрочышча ніводную машыну. Пасля і яны з'ехалі...

— А колькі зямлі займае ваша цяпліца? І калі вы занялі тыя соткі? Каму ўвогуле належыць зямля ва ўрочышчы Рублёўскае?..

— 12 сотак... Недзе ў студзені пачалі з мужам абсталёўваць цяпліцу. А чаму так? Доўга дабівалася, каб мне выдзелілі надзел пад цяпліцу, але ўсё безвынікова. Маўляў, няма ў наяўнасці ніякіх участкаў, і выдзеліць мне нічога не могуць. Але ж па законе мая сям'я мае права на 90 сотак зямлі. На сённяшні дзень не хапае 16 сотак. Я прасіла: хай меней, але каб больш-менш прыдатная для цяпліцы зямля, а не абы-які пустэльнік. Кажуць — незаконна, кажуць — зямля належыць СВК... А як мне карміць дзяцей, з чаго жыць — нікому ніякай справы. То і заняла: думаю, укапаю хоць слупы, а далей буду дамагацца тае зямелькі. Колькі разоў звярталася ў Брэсцкі аблвыканкам, каб патрапіць да спадара Сумара, — безвынікова. А ягоны намеснік па зямельных пытаннях Якаў Адамавіч Бухавіцкі спачатку даслаў адпіску: маўляў, вам прапаноўвалі іншы ўчастак, а тут вам не могуць выдзеліць. Тады паехала на прыём і стала прасіць: ну хаця б — як выключэнне — выдзеліце ў часовае карыстанне тыя 12 сотак. Адказ наступны: я такімі паўнамоцтвамі не валодаю... Ды яшчэ ўшчувае: вас ніхто не крыўдзіць — гэта вы пайшлі супраць усіх...

— Памятаю, на сходзе вы палемізавалі са старшынёй райвыканкама... То, можа, і на праўду супрацьпаставілі сябе ўладзе?

— Я проста б'юся, як і ўсе астатнія вяскоўцы, за кавалак зямлі, бо яна — крыніца хоць якога дабрабыту. Вось і ўсё. Канечне, ім не падабаецца, калі хто адкрые рот, высунецца і заявіць пра свае правы. Але што застаецца, як не гэта? Перад 8 Сакавіка шматдзетным мацяркам у буфеце райвыканкама наладзілі свята, уручалі — у тым ліку і мне — ордэн Маці. Усё было хораша, прыгожа... А пасля і кажуць: можа, у каго якія праблемы, цяжкасці, то не саромейцеся, кажыце... Маўчаць. І тады я папрасіла слова. Кажу: вось на ўзроўні прэзідэнта клапоцяцца пра шматдзетныя сем'і, апякуюцца пра дэмаграфію — гэта добра. Шкада толькі, што на мясцовым узроўні — анякага клопату. І распавяла пра сваю праблему... Тое цяпер і адгукаецца, а як жа — праўда вочы коле...

Мы размаўлялі яшчэ нейкі час... І можна было б унікаць у дэталі, нюансы "зямельнай справы" ў агурковым краі, але і без таго зразумела: простыя вясковы чалавек і мясцовая ўлада — па розныя бакі зямельнай барыкады...

Георгій ЧЫГІР.
Фота аўтара.



А цяпер уявіце: такая ж цяпліца зруінавана па волі ўлад.

ПОДСЧИТАЛИ

Все хорошо, прекрасная маркиза?

В Беларуси в январе—феврале 2013 года убыточными были 1093 организации, или 13,3% от общего их количества. Об этом сообщает Национальный статистический комитет.

Сумма чистого убытка убыточных организаций за январь—февраль нынешнего года составила 1,8 триллиона рублей, что в 1,6 раза больше, чем за такой же период предыдущего года.

А вот чистая прибыль организаций, согласно данным все того же Белстата, в январе—феврале 2013 г. снизилась на 34,3% по сравнению с аналогичным периодом 2012 года и составила 7,6 триллиона рублей. Рентабельность реализованной продукции, товаров, работ, услуг снизилась до 8,6% (с 12,7% в январе—феврале 2012 г.), рентабельность продаж упала до 6,8% (с прошлогодних 10%).

ПЕРЕГОВОРЫ

Россияне делят МЗКТ

Сразу несколько российских СМИ опубликовали информацию, касающуюся Минского завода колесных тягачей. То, что белорусское предприятие перейдет под контроль России, как они утверждают, однозначно. Но вот под чей именно контроль?

Первым о некоторых деталях проекта по созданию российско-белорусского СП с участием МЗКТ рассказало информационное агентство "ФедералПресс. Приволжье". По данным источника агентства, 3 апреля во время посещения Госвоенпрома Беларуси нижегородской делегацией во главе с губернатором Валерием Шанцевым было подписано соглашение о намерении по продаже контрольного пакета акций ОАО "Минский завод колесных тягачей" Нижегородскому машиностроительному заводу (НМЗ), входящему в концерн ПВО "Алмаз-Антей".

Надо сказать, что НМЗ еще с советских времен участвует в выпуске зенитных ракетных систем семейства С-300. В частности, в Нижнем Новгороде изготавливаются транспортно-контейнерные и транспортируемые пусковые установки, антенные посты радиолокаторов подсветки и наведения. Причем колесные шасси и полуприцепы для размещения этой техники традиционно поставлял в рамках производственно-технической кооперации МЗКТ.

Правда, буквально через пару дней в московской газете "Известия" появилась статья с утверждением, что наиболее вероятным держателем контрольного пакета акций МЗКТ станет Камский автомобильный завод. В качестве запасной кандидатуры, согласно утверждению издания, рассматривается нижнетагильский "Уралвагонзавод" (хотя, заметим, основной специализацией последнего является выпуск бронетанковой техники). На таком варианте, дескать, настаивают круги, близкие к российскому правительству.

Минск по поводу закулисных торгов о дальнейшей судьбе МЗКТ молчит, будто набрал в рот воды. Хотя это одно из самых успешных белорусских предприятий. Напомним, что Минский завод колесных тягачей изготавливает шасси для подвижных стратегических ракетных комплексов, для оперативно-тактических, зенитных ракетных и береговых ракетных комплексов, а также для ряда "мирных" сфер.


Олег СНОВ.

СОЦИОЛОГИЯ

Белорусы — закоренелые прагматики?

Исследовательская группа Белорусского института стратегических исследований провела опрос среди наших соотечественников, чтобы выяснить, как изменилась их геополитическая ориентация за последние три года. Ученые сделали несколько выводов. Сначала убедились в том, что население начало постепенно понимать, что нельзя быть одновременно в двух союзах (падение с 28,2% в 2011 г. до 20% в 2013 г.).

Все больше белорусов хотят жить в независимой стране



Затем выяснилось, что **увеличилось число приверженцев независимости Беларуси** (вне всяких союзов) — с 20,4% в 2010-м до **30,9%** в 2013 году. Видимо, постоянные информационные войны и энергетические конфликты с Россией сыграли свою негативную роль.

Примечательно и понимание белорусами самой сущности интеграции. Из 43,3% высказавшихся за союз с Россией **49,3% считают наиболее приемлемой формой интеграции всего лишь создание зоны свободной торговли**, 30,4% выступают за единое экономическое пространство без политического объединения и **лишь 6,3%** (или 2,7% от общего числа опрошенных) желали бы вхождения Беларуси в состав России на правах автономии.

Для улучшения экономики белорусы готовы идти на определенные жертвы



А вот если ставить вопрос о допустимости объединения Беларуси в единое государство с Россией в целях улучшения экономической ситуации в стране, то данные будут другие. Объединение Беларуси и России в единое государство считают допустимым 19,2%, допустимо только при определенных условиях — 50,4%, недопустимо ни при каких обстоятельствах — 21,9%. При этом в динамике наблюдается существенное падение привлекательности объединения с Россией. Количество считающих допустимым объединение в одно государство **снизилось с 2010 года почти на 20%,** а число считающих такое объединение недопустимым ни при каких обстоятельствах возросло на 9,3% за тот же период.

Так Россия или Евросоюз?



Практически одинаковое число респондентов (35% и 34%) считает, что у нас и с Россией, и с ЕС отношения "ни хорошие, ни плохие". При этом очевидно, что отношения с РФ характеризуют как намного более позитивные.

Респондентам стало **труднее выбирать,** где лучше жить (стало больше затруднившихся ответить), за счет падения привлекательности РФ. Тем не менее ЕС продолжает значительно проигрывать России в привлекательности для белорусов.



Однако если бы завтра на референдум был вынесен вопрос о присоединении Беларуси к ЕС, то количество проголосовавших "за" превысило бы количество проголосовавших "против". Причем их количественное соотношение остается почти неизменным с 2010 года.

Исходя из данных опроса, **72,9%** белорусов считают, что союзника нужно выбирать исходя из экономических соображений ("насколько это улучшит экономическое положение в стране"), на втором месте безопасность — 10,6% (у экономики рост 18% по сравнению с 2010 годом, безопасность сократилась на 7%). То есть геополитический выбор продолжает осуществляться по "гамбургскому счету", эта тенденция с 2010 года еще более усилилась.

Половина белорусов против продажи "фамильного серебра" россиянам



Что же касается продажи "фамильного серебра" россиянам, то она недопустима ни при каких обстоятельствах. Так ответили 50% опрошенных, но при этом 50% готовы к объединению с РФ в единое государство при определенных условиях. Оказывается, наши соотечественники проявляют определенную уступчивость, если речь заходит об их благосостоянии.

Исследователи выяснили, что к созданию Евразийского союза положительно относятся 50,1%, а отрицательно — 15,3%. Тех, кому все равно, — 25,8%. Наблюдается резкий рост числа респондентов, считающих что страна потеряет независимость **(11,1% в 2011, 42,9% — в 2013)** — определились и те, кому раньше было "трудно сказать".

Белорусское общество не информировано о европейских институтах

Ничего не знает о "Восточном партнерстве" **86%** населения. И это неудивительно, учитывая "насыщенность" информации в этом вопросе в государственных СМИ. Еще хуже обстоят дела в плане знаний о Европейском диалоге о модернизации — о нем не знают **95%** опрошенных.

Санкции ЕС и визы

Выяснилось, что значительная доля респондентов по-прежнему считает, что санкции ЕС были введены из-за того, что Беларусь проводит независимую политику. Про нарушения прав человека говорят меньше респондентов. С визами — похожая ситуация. Интересно, что при этом значительная доля населения (45,6%) хотела бы получать больше информации о ЕС.

Директор BISS **Алексей Пикулик** сказал "Народной Воле", что в скором времени исследователи проведут более глубокий анализ, в частности, попытаются проанализировать причины нашего прагматизма: "*Есть большое количество наций, где геополитическая детерминанта более ценностная. У белорусов интеграция детерминирует исключительно в пользу экономики. Мы будем искать закономерность. Будем пытаться найти те переменные, которые бы определяли рост проевропейского, пронезависимого, пророссийского настроения. Будем сопоставлять данные опроса, приплюсовывать данные других опросов и так называемые жесткие цифры (рост инфляции, ВВП, политика, идеология). Будем смотреть, где у нас будет получаться наибольшее количество ответов*".

Дарья СОЛТАН.

АФІЦЫЙНА

Пад скарачэнне — кожны чацвёрты чыноўнік

Указ А.Лукашэнкі "Аб некаторых мерах па аптымізацыі сістэмы дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый, а таксама колькасці іх работнікаў" набыў моц з 12 красавіка і прадугледжвае скарачэнне колькасці работнікаў дзяржаўных органаў і арганізацый у сярэднім на 25%. Правесці скарачэнне згодна з указам трэба да 1 ліпеня, у некаторых выпадках — да 1 студзеня 2014 года .

Хто з чыноўнікаў трапіў пад указ?

Па-першае, супрацоўнікі выканкамаў. Скарачэнні павінны прайсці ва ўсіх абласных і Мінскім гарадскім выканаўчых камітэтах. Яны ж павінны паклапаціцца і аб скарачэнні раённых, гарадскіх і мясцовых адміністрацый. З ліпеня, напрыклад, у Мінскім гарадскім выканаўчым камітэце павінна быць 570 супрацоўнікаў, а ўсяго ў сістэме ўпраўлення горада Мінска — 1427 чалавек. Зараз іх колькасць перавышае 1800 чалавек.

Таксама парадзеюць рады шматлікіх канцэрнаў і ведамстваў. Напрыклад, прадпісана не менш як на 27 працэнтаў скараціць штат "Белдзяржхарчпрама" і канцэрна па нафце і хіміі, не менш як на 15 працэнтаў — канцэрна лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці і канцэрна па вытворчасці і рэалізацыі тавараў лёгкай прамысловасці. Не менш як на 24 працэнты павінен зменшыцца склад работнікаў Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва.

Скарачэнні павінны адбыцца і ў іншых дзяржаўных установах, непасрэдна падпарадкаваных рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання. Пад скарачэнне трапіла нават Белтэлерадыёкампанія.

На шэраг міністэрстваў указ ускладзе дадатковыя задачы і функцыі. У гэты спіс трапілі Міністэрства гандлю, Міністэрства замежных спраў і Міністэрства эканомікі.

Дарэчы, некаторыя дзяржаўныя інстытуты ўвогуле знікнуць. Напрыклад, ліквідуецца Рэспубліканскі працоўны арбітраж. Але будзе захаваны прававы інстытут працоўных арбітражаў, які непасрэдна вырашае калектыўныя працоўныя спрэчкі. Натарыусы з 1 студзеня 2014 года страцяць статус дзяржслужачых, а сам інстытут павінен быць рэфармаваны.

ЗАМЕСТ КАМЕНТАРЫЯ

«Спазніліся на 15 гадоў»

Наколькі эфектыўным і карысным для краіны стане скарачэнне дзяржапарату? Ці не з'яўляецца ідэя аптымізацыі колькасці чыноўнікаў чарговай прафанацыяй? Сваім меркаваннем мы папрасілі падзяліцца прэм'ер-міністра Беларусі ў 1994—1996 гадах Міхаіла ЧЫГІРА.

— Указ аб скарачэнні дзяржапарату можна толькі вітаць, — кажа Міхаіл Мікалаевіч. — Відавочна, што ў сучаснай Беларусі зашмат чыноўнікаў, а мы не такая багатая краіна, каб карміць такі штат. Табліцы Мендзялеева ў беларускіх нетрах няма, як, напрыклад, у Расіі. Трэба на чымсьці эканоміць.

Але, на мой погляд, улады спазніліся не толькі з тэрмінам з'яўлення ўказа, але і з працэнтамі, вызначанымі для скарачэння. Думаю, за аснову трэба было браць штатны расклад 1970—1980-х гадоў і ўкараніць яго з невялікай карэкціроўкай. У той час насельніцтва Беларусі было амаль такім, як зараз, было больш калгасаў, невялікіх прадпрыемстваў, але чыноўнікаў працавала значна менш, і яны спраўляліся са сваімі функцыямі. Працэнтаў на 40 чыноўнікаў тады было менш, сілавікоў значна менш...

Пасля распаду Саюза ліквідавалі партыйныя структуры — райкамы, абкамы партыі і г.д. Партыйнай праслойкі не стала, але ў Беларусі пачалі расці ў шырыню выканкамы, пачалі з'яўляцца новыя службы, якія выводзіліся за межы выканкамаў, пашырылася служба дзяржкантролю. А ўжо раздзьмулі сілавыя ведамствы — КДБ, МУС, з'явілася зусім новая структура — Савет бяспекі. За апошнія 10—15 гадоў так званая аптымізацыя дзяржапарату прывяла да адваротнага эфекту. І з указам аб яго скарачэнні мы спазніліся як мінімум гадоў на 15.

Але добра, што хоць зараз спахапіліся. І хочацца думаць, што гэта не стане чарговай папулісцкай кампаніяй. Хаця пытанняў узнікае шмат. І першае: куды пойдзе працаваць армія звольненых чыноўнікаў? Ці не будуць іх працаўладкоўваць загаднымі метадамі, ці не з'явяцца новыя дзяржструктуры? Бо на дадзены момант цяжка здагадацца, дзе яны могуць працаваць. На мой погляд, трэба скарачаць падаткі, ствараць умовы, каб у Беларусь ішлі інвестыцыі, бізнес, з'яўляліся новыя працоўныя месцы, каб чалавек сам мог на сябе зарабляць.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Не кінуць...

Згодна з указам, чыноўнікаў, якія пазбавяцца працы падчас скарачэння, павінны працаўладкаваць іх былыя начальнікі, прычым па спецыяльнасці, у тым ліку шляхам пераводу на іншую, не звязаную з дзяржаўнай службай працу.

Таксама чыноўнікам на перыяд іх працаўладкавання прадастаўляюцца некаторыя льготы: права на адтэрміноўку вяртання крэдытаў на будаўніцтва, набыццё жылля, а таксама для аплаты навучання пры атрыманні першай вышэйшай адукацыі іх дзецьмі. Таксама ім даецца права на медабслугоўванне ва ўстановах аховы здароўя, да якіх яны адносіліся да звальнення. Але карыстацца гэтымі льготамі чыноўнікі, што падпадуць пад скарачэнне, могуць не больш як 12 месяцаў з дня звальнення.

Заробкі падскочаць

А як будуць выкарыстоўвацца сэканомленыя на скарачэнні дзяржштату грошы? Адказ на гэтае пытанне Аляксандр Лукашэнка даў яшчэ ў студзені, калі праводзіў нараду па пытаннях аптымізацыі сістэмы дзяржорганаў. "Я адчуваю, што 25% мы проста можам скараціць, вызвалім амаль 130 мільёнаў долараў па годзе, — заявіў тады Лукашэнка. — Гэта добрыя грошы. І плюс з бюджэту дабавім, і гэта той фонд, якім мы можам карыстацца для павышэння заработнай платы астатнім".

У Мінску будуць маліцца за Папу Рымскага Францішка

Каталіцкія біскупы і святары ўрачыста адзначаць пачатак пантыфікату Папы Францішка.

16 красавіка ў 17.00 у мінскай архікатэдры Апостальскі нунцый у Рэспубліцы Беларусь арцыбіскуп Клаўдыа Гуджэроці ўзначаліць імшу з удзелам усіх каталіцкіх біскупаў Беларусі, каб урачыста адзначыць пачатак пантыфікату Папы Рымскага Францішка.

На ўрачыстасць запрошаны прадстаўнікі дзяржаўнай улады і акадэмічнай супольнасці Беларусі, прадстаўнікі дыпламатычнага корпусу, акрэдытаваныя ў Мінску, прадстаўнікі Беларускай праваслаўнай царквы.

Акрамя таго, у 19.00 у Калоннай зале Палаца культуры прафсаюзаў у Мінску адбудзецца ўрачысты прыём, арганізаваны Апостальскай нунцыятурай у Рэспубліцы Беларусь для каталіцкіх біскупаў і ардынарыяў, прадстаўнікоў дзяржаўнай улады, рэлігійных лідараў і прадстаўнікоў дыпламатычнага корпуса.

Генерал-майор милиции Найденко возглавил Дворец тенниса

У Республиканского центра олимпийской подготовки по теннису появился новый директор. Им стал генерал-майор милиции Александр Найденко, более известный по работе в органах внутренних дел.

Известность к Александру Найденко пришла в бытность заместителем начальника ГУВД Минска — начальника милиции общественной безопасности и правопорядка. Именно под его руководством на Октябрьской площади весной 2006 года был ликвидирован палаточный лагерь, сооруженный сторонниками оппозиции.

После минских геройств 29 марта 2008 года Найденко возглавил УВД Витебского облисполкома и продержался на этой должности до лета 2012 года. После этого генерал-милиционер был уволен из органов внутренних дел в запас по возрасту с правом ношения установленной формы одежды и знаков различия. До последнего времени возглавлял Службу безопасности Банка развития.

SOS!

Больше миллиона белорусских женщин подвергаются домашнему насилию

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Стоит заметить, что в Минске количество "бытовых" убийств увеличилось в 3,5 раза! К проблемным регионам сотрудники правоохранительных органов также относят Витебщину, где по сравнению с минувшим годом "бытовых" убийств зафиксировано вдвое больше, и Могилевщину, где больше всего совершено умышленных причинений тяжких телесных повреждений.

Слезы? Только от лука!

Во многих европейских странах проблема домашнего насилия из семейной уже давно превратилась в общественную.

"*Давайте подумаем, какие экономические потери несет государство, если женщины страдают от домашнего насилия?* — призывает руководитель группы управления проектами по предотвращению домашнего насилия и гендерному равенству Фонда ООН в области народонаселения **Галина Десятова**. — *Какой работник из такой женщины? Очевидно, что домашнее насилие накладывает отпечаток на ее самореализацию и это влечет потери и для экономики страны...*"

В эти дни в Беларуси стартовал очередной этап профилактической акции "Дом без насилия".

"*Мы разбили этот долгоиграющий проект на несколько "комнат" — кухня, детская и спальня без насилия,* — рассказывает Галина Десятова. — *В качестве лица нашей кампании хотели видеть яркую женщину, реализовавшую себя в семье, успешную в бизнесе. Мы пригласили **Юлию Высоцкую**, которая долгое время училась и работала в Беларуси. Она совершенно бесплатно согласилась нам помочь*".

Ролик с Юлией Высоцкой со слоганом *"И путь ваши слезы будут только лука!"* наверняка видели многие. Видеообращение Высоцкой снималось в продюсерском центре **Андрея Кончаловского.** Причем, по словам Галины Десятовой, Юлия согласилась участвовать в этой кампании не за деньги, а просто потому, что считает ее очень важной.

Стыдная тема?

В настоящее время в Беларуси действуют 50 кризисных комнат, куда могут обратиться за психологической и юридической помощью жертвы насилия.

"*Они не совсем однородно распределены по стране. Так, в Бресте — пять, в Витебске — шесть, в Гомельской — пять, в Гродненской — три, в Минске — одна, в Минской области — пять,* — говорит главный специалист управления народонаселения, гендерной и семейной политики Минтруда и соцзащиты **Елена Комлик. —** *Больше всего кризисных комнат открыто в Могилевской области — там их 25*".

Правда, при миллионе пострадавших от насилия женщин за минувший год туда обратилось всего лишь... 124 человека.

"*Если смотреть статистику МВД и количество обращений на "Горячую линию", то это действительно незначительное количество обращений,* — прокомментировала "Народной Воле" цифры Елена Комлик. — *Но 124 — это те, кто проживал в кризисных комнатах. Количество обратившихся по этому вопросу в территориальные центры — в разы больше. Не всем ведь пострадавшим от домашнего насилия требуется убежище, а здесь мы говорим именно о тех, кому нужен был приют.*

Вместе с тем обратившихся могло бы быть и больше, но здесь не последнюю роль играет и наш менталитет, нежелание обращаться и к правоохранителям, и в органы соцзащиты, особенно это касается маленьких городов, где по-прежнему считается стыдным выносить сор из избы. А некоторые по старинке считают, что если бьет, значит, любит..."

ТОЛЬКО ЦИФРЫ

Кто жертва?

Согласно данным Международного общественного объединения "Гендерные перспективы", чаще всего от домашнего насилия страдают женщины (93%) преимущественно 27—40 лет (31%) и старше 60 лет (около 19%). Причем из них 41% проживает в Минске. Больше половины тех, кто рассказывает специалистам "Горячей линии" о домашнем насилии, состоят в браке и имеют детей, 21% — разведены.

Кто тиран?

26% агрессоров — люди, не имеющие постоянного места работы либо безработные.

28% — рабочие и специалисты среднего звена.

5% — руководители и государственные служащие.

5% — предприниматели.

3% — военнослужащие и сотрудники правоохранительных органов.

Больше половины агрессоров имеют алкогольную зависимость, 2% — наркотическую.

Согласно милицейской статистике, 75% таких преступлений совершается в состоянии алкогольного опьянения, а на каждое третье преступление идут ранее судимые мужчины.

Марина КОКТЫШ.

ЧЫТАЧ — ЧЫТАЧУ

Сена-салома на адным возе

Пагаджаюся з пенсіянерам М.Ф.Сокурам, аўтарам допісу ў "Народнай Волі" "Рубель, талер ці белар?" (№11 ад 8.02.2013 г.) у тым, што **ад самой назвы** нацыянальнай валюты той ці іншай краіны не залежыць дабрабыт і свабода яе народа. Але калі ўжо на старонках газеты вядзецца абмеркаванне гэтай тэмы, дык не магу ўстрымацца ад унёску сваёй капейкі ў агульную скарбонку разваг і меркаванняў. Адразу скажу: я — за нацыянальную валюту.

Мне здаецца, што не горш, чым талер і белар, гучала б і карысталася прыхільнасцю ў насельніцтва Беларусі наша шырокаўжывальнае слова *беліца* ("беліц"). Яно даволі часта сустракаецца на геаграфічнай карце краіны, пастаянна гучыць у размоўным ужытку ўсіх куткоў беларускай зямлі.

Вось толькі некалькі прыкладаў. Беліца — Лукаўскі канал у басейне ракі Днепр; вёскі ў Жлобінскім, Лідскім, Гомельскім раёнах, Беліцк — рабочы пасёлак у Рагачоўскім раёне; Новая Беліца — адзін з чатырох адміністрацыйных цэнтраў Гомеля; Беліцкая сядзіба — помнік сядзібна-паркавай архітэктуры ў вёсцы Беліца Сенненскага і сядзіба першай паловы XVII стагоддзя ў вёсцы Беліца Лідскага раёна. Геаграфы і гісторыкі гэты спіс могуць значна пашырыць. Мушу дадаць, што ў Беларусі паўсюдна ўжываюцца словы *белы, бяляны, бялянка* ў самым разнастайным сэнсе і значэнні. Тут і наш ядомы грыб сямейства сыраежкавых, і кужаль, і, нарэшце, дзяўчына з ільнянымі косамі. Досыць істотна і вызначальна тое, што нашы прашчуры прымалі, а Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь падоўжыў іх выбар, прыняўшы дзяржаўны бел-чырвона-белы сцяг. Не выключана, што калі-небудзь на чале нашай краіны стане жанчына з мілымі і мяккімі, быццам з беларускага льну, косамі.

Яшчэ дзве дадатковыя, таксама важныя, на мой погляд, падставы для ажыццяўлення маёй прапановы. *Беліца* ў беларускай мове адносіцца да слоў жаночага роду, а *рубель* — да мужчынскага. Ну і што? Нашы суседзі-ўкраінцы карыстаюцца грыўнай, назва якой таксама належыць да жаночага роду. Еўрапейскія краіны ўвялі еўра, сярэдняга, калі дакладней, ніякага роду. Прыкінуў я — і атрымліваецца, што слоўны тэрмін *беліца* лёгка скланяецца і гэтак жа лёгка спалучаецца са словамі ў любым сказе. Вось прыклады: "Распісаўся ў ведамасці за атрыманне пяці беліц (беліцаў)", "Шабашнікі запатрабавалі за паслугу тысячу беліц (беліцаў)", "Пазычце мне, калі ласка, адну беліцу". Што тычыцца канчатка слова *беліца*, дык гэта ўжо прэрагатыва дасведчаных беларускіх мовазнаўцаў.

Завяршу свае разважанні тым, з чаго пачынаў. Сапраўды, не істотна, як будзе называцца наша нацыянальная валюта. Важна толькі, каб не дубліраваўся расійскі рубель, бо гэта раўназначна скрыжаванню нашай нацыянальнай мовы з расійскай. І пра самае страшнае. З упэўненасцю можна выдаць прагноз, што пры далейшым існаванні гэтых двух складнікаў Рэспубліка Беларусь можа спыніць сваё існаванне як самастойная дзяржава. Бо, калі не памыляюся, з былых рэспублік былога СССР толькі наша краіна захавала рубель і, па сутнасці, прымусова перайшла на рускую мову.

Яшчэ адзін нюанс, які з'яўляецца ўжо своеасаблівым містычным прадказаннем. У беларускай мове ёсць слова "рубЕль" з націскам на другім складзе і "рУбель" з націскам на першым складзе. З дапамогай энцыклапедычнага тлумачальнага слоўніка беларускай мовы даводжу да ведама аматараў рускамоўнасці, што рУбель з націскам на першым складзе — гэта тоўстая (звычайна дубовая) жэрдка, якой бесправы ўціскаюць сена, салому на возе. Беспамылкова зазначу, што падрыхтоўку дубовай жэрдкі ініцыявала і сваім прыкладам працягвае звязваць сена з саломай на адным возе вышэйшае кіраўніцтва пакуль яшчэ існуючай Рэспублікі Беларусь, адначасова працягваючы выкрэсліванне з ужытку нашай нацыянальнай мовы. Даруйце, а як інакш расцаніць той факт, што ніхто з нашых функцыянераў на мерапрыемствах агульнадзяржаўнай важнасці не выступае на мове тытульнай нацыі, што практычна ўсе друкаваныя дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі дружна пераведзены на рускую мову? Такога, здаецца, няма ні ў адной цывілізаванай краіне свету. Выходзіць, што Беларусь ужо гатова легчы ў звязак з Расіяй пад дубовай жэрдкай уласнага вырабу.


Касцёл у вёсцы Беліца Лідскага раёна

Мікалай Міхайлавіч ЕРМАКОЎ.

Гомель.

РЕЗОНАНС

Сколько стоит учитель?

Среди различных проблем общественной жизни страны наибольший интерес у меня вызывают проблемы системы образования. Сказываются 40 лет работы в этой сфере. Особенно внимательно слежу за появляющимися в средствах массовой информации материалами, посвященными нынешним проблемам нашей школы. Не стала в этом плане исключением и опубликованная в "Народной Воле" №27 от 5 апреля под броской рубрикой "Задумайтесь..." статья кандидата исторических наук, доцента Леонида Цыганкова **"Труд учителя должен цениться так, как он ценился в 1913 году".** Нельзя не приветствовать стремление автора привлечь внимание общественности к одной из злободневных проблем — престижу профессии учителя в нашем обществе. Для меня эта проблема особенно близка, так как с 1996-го по 2002 год ею приходилось предметно заниматься, работая в должности председателя областного комитета отраслевого профсоюза.

10 миллионов и туалет за сараем

Реалии ныне таковы, что выдвинутый известным классиком на заре Советской власти лозунг *"Учитель должен быть у нас поставлен на такую высоту, на которой он никогда не стоял, не стоит и не будет стоять ни в одном буржуазном обществе"*, в полной мере реализован. Правда, с точностью до наоборот. О чем свидетельствуют приведенные Л.Цыганковым статистические данные о средней зарплате учителя в нашей стране и в странах "капитала". Не прибавляет оптимизма и тот факт, что, имея два десятка лет назад одинаковую оплату педагогического труда от Бреста до Сахалина, белорусский педагог ныне все больше отстает от своих собратьев по Таможенному союзу — России и Казахстана. Вместе с тем со многими положениями статьи Л.Цыганкова не могу согласиться. Что, собственно говоря, и понудило меня сесть за компьютер.

Во-первых, сравнительная оценка труда нынешнего белорусского учителя и его российского собрата столетней давности мне представляется не совсем корректной. Даже если согласиться с тем, что, исходя из золотого эквивалента, 27 рублей 1913 года равны 9,5 млн нынешних белорусских "зайчиков". Две в значительной мере отличающиеся друг от друга эпохи. Технический прогресс и совершенно разные формы и условия труда. Значительное увеличение доли интеллектуального труда в сравнении с трудом физическим. Исчезновение одних профессий и появление новых. Переход от массовой неграмотности населения к всеобщему среднему образованию. Профессия педагога стала массовой. Наш предок в начале прошлого века не мечтал о покупке холодильника, телевизора, компьютера, автомобиля и т.д. Сравнение поэтому весьма условно. Кроме того, цена труда учителя — это не только его "денежное довольствие". Это и престиж педагогического труда в обществе, и принимаемые государством и обществом меры по моральному поощрению работников сферы. Почему многие, зачастую высокопрофессионально подготовленные, учителя уходят из школы? Причин много: абсолютное бесправие учителя, рабская контрактная система, огромный объем никому не нужного бумаготворчества, привлечение педагогов к выполнению несвойственных им функций. В какой еще стране учителей понуждают заниматься противоправной, скажем прямо, преступной деятельностью — фальсификацией итогов избирательных кампаний?

А что ждет молодого специалиста, как правило, девушку, в сельской школе (84 процента работающих в школе педагогов — женщины)? Бытовая неустроенность (съемная квартира, туалет за сараем, холодная вода в колодце, с горячей проблемы), ограниченные возможности общения, трудности профессионального роста, плохое транспортное сообщение. Весьма мрачное будущее.

Простая математика

Оценивать труд учителя, как мне представляется, следует с учетом этих и многих других параметров. Не соответствуют действительности, как мне представляется, ряд других умозаключений Л.Цыганкова. Процитирую второй абзац его заметки: *"По закону и нормативам ставка учителя в неделю утверждена — 18 часов работы. Но среднемесячная зарплата учителя в 3 млн 279 тысяч выдается, если учитель работает в неделю 23 часа. То есть обман заключается в том, что учитель работает на 1,4 ставки, а получает одну ставку. 0,4 ставки оседает у кого-то в кармане. Более того, в 1970—1980-е годы ставка учителя была не 18, а 16 часов. А зарплата составляла 150 процентов от средней зарплаты по стране".*

Не могу согласиться ни с одним из приведенных здесь утверждений.

Во-первых, ставка учителя в неделю — **18 часов работы.** 18 часов — это учебная нагрузка учителя (18 уроков в неделю). Его рабочая неделя при такой учебной нагрузке составляет 36 часов. В нее включены подготовка к урокам, проверка тетрадей, организация и проведение внеклассных и внешкольных мероприятий с учащимися, дежурство по школе, работа с родителями, участие в работе методических объединений и т.д. Эта работа жестко не регламентирована и в каждом конкретном случае организуется в соответствии с планом работы школы и личным планированием педагога. *Во-вторых*, 23 часа учебной нагрузки — это не 1,4 ставки, а 1,28 (23:18). *В-третьих*, ставка учителя в 18 часов была установлена в 1936 году и никогда не опускалась ниже этой планки. В том числе в 1970—1980-е годы. Равно как и зарплата учителей не достигала не то что 150 процентов, но даже 100-процентного рубежа средней по стране.

И, наконец, утверждение Л.Цыганкова о массовом обмане учителей при выплате зарплаты. Обвинение очень серьезное. Произведем несложные арифметические действия. 0,4 ставки среднестатистического учителя — это 1.311.600 рублей (3.279.000x0,4). Согласно статистическим данным Министерства образования, в текущем учебном году в общеобразовательных школах страны работает 107.645 учителей. Таким образом, по мнению автора, незаконно "оседает у кого-то в кармане" 141.187.182.000 рублей, или 16,5 млн долларов США. И это за месяц. За год набегает сумма в 1,694 триллиона рублей. Это уже махинации в особо крупных размерах. Естественен вопрос: почему безмолвствует Следственный комитет? Ответ прост: ничего подобного на практике не существует. Причина заблуждения Л.Цыганкова, как мне представляется, заключается в том, что он в своих умозаключениях взял за основу вузовскую систему оплаты труда работников и автоматически перенес ее на общеобразовательную школу. В школе же она совершенно иная.

Ежегодно перед началом учебного года в каждом общеобразовательном учебном заведении производится тарификация педагогических работников школы. Утверждается учебная нагрузка каждого учителя и в соответствии с нею, его образованием, квалификацией, стажем работы определяются размеры оплаты его труда.

Вспоминаю начало своей трудовой деятельности, когда моя учебная нагрузка в сельской средней школе на Столинщине при норме 18 составляла 41 час физики. При оплате тогда ставки в размере 66 рублей начисленная мне зарплата составляла более 140 рублей. Зависимость уровня заработной платы от количества учебной нагрузки приводит к стремлению большинства учителей заполучить побольше "часов". Отсюда и анекдот: грабителю, который напал на учителя и потребовал отдать часы, тот отвечает: "Часы" не отдам, забирай классное руководство!" Другое дело, что механизм распределения учебной нагрузки весьма несовершенен. К минимуму сведена роль профсоюзных комитетов, призванных защищать права и интересы своих членов. Подобная ситуация и при распределении премиального фонда, составляющего 20 процентов от фонда оплаты труда. Во многих случаях эти вопросы решаются келейно, главным образом единолично руководителями образовательных учреждений.

Сталин как благодетель

Неточен Л.Цыганков и при постановке других проблем. Реформы в системе образования и оптимизация сети образовательных школ — это разные вещи. Нельзя смешивать общее с частным. При ежегодном утверждении сети учебных заведений в каждом регионе ставится цель не сохранить бюджетные средства, как он утверждает, а рационально их использовать. Процесс сокращения числа сельских школ — естественный процесс. Постоянно уменьшается численность сельского населения. Не задерживается на селе молодежь, вследствие чего резко уменьшается рождаемость и количество детей школьного возраста. Приведу лишь один пример. Если в 1970 году в Брестской области функционировало 1411 учреждений общего среднего образования, то в текущем учебном году их осталось только 573. Сказанное означает, что за эти годы в 838 населенных пунктах области перестала функционировать школа. Умирает деревня, сколько бы ни утверждалось обратное и ни показывалась по каналам БТ "квітнеючая беларуская вёска". Когда численность детей в школе приближается к численности педагогического и обслуживающего персонала, а в классе 1—3 ученика, содержать такую школу накладно для бюджета. Это процесс очень болезненный, и решение его в каждом конкретном случае сопряжено с рядом негативных моментов. Недостаток общественного и специального транспорта для подвоза детей, плохие дороги, сложности с трудоустройством теряющих работу педагогов — далеко не полный перечень проблем, требующих решения.

Не следует болезненно реагировать на высказываемые предложения по "укрупнению классов" до 30 человек. В соответствии с п.13 статьи 158 Кодекса об образовании РБ, вступившего в силу с сентября 2011 года, наполняемость классов не должна превышать в 1—4-х классах — 20 учащихся, 5—11-х — 25 учащихся. Судя по отчетным данным, эти нормативы в основном соблюдаются. По Брестской области в текущем году средняя наполняемость 1—11-х классов составила 16,2 ученика, а в сельских районах она еще ниже: Барановичский район — 8,8, Пинский — 10,2, Ляховичский — 11 учащихся.

Нехорошо спорить с кандидатом исторических наук по фактам, связанным с историческим прошлым. Но никак не могу согласиться с утверждением Л.Цыганкова: *"Даже Сталин понимал, какую роль в обществе играют педагоги! В те годы было установлено достаточно высокое денежное содержание педагогических кадров... Учитель имел зарплату на 150 процентов выше зарплаты квалифицированного рабочего".* Откуда все это?! Приношу извинения за некоторые биографические подробности, но помню уровни зарплаты мамы, проработавшей с 1938-го по 1972 год (исключая период оккупации) учительницей начальных классов сельской школы. В сравнении с колхозниками, которые практически не получали ничего, зарплата учителя была явно выше. Но далеко не на 150 процентов выше того, что получал квалифицированный рабочий. Кстати, **на 150 процентов выше** означает, что зарплата педагога выше зарплаты квалифицированного рабочего в 2,5 раза. В моем понимании, Сталин не заботливый благодетель, а кровавый палач, несущий личную ответственность за массовые репрессии против народа своей страны. Среди жертв режима на территории Беларуси цвет интеллигенции, в том числе и учителей. Проанализируйте списки репрессированных в 1930-е годы, опубликованные в газетах, в том числе и в "Народной Воле".

Вместо комментария

Можно было бы и дальше продолжать цитировать весьма спорные утверждения автора: *"От ученых и педагогов требуют создавать не интеллектуальный продукт, а в первую очередь коммерческий*" или *"Детей учат брать пример не с ученых, врачей, летчиков, а с деятелей шоу-бизнеса*" и т.д. Непонятно, кто требует, кто учит?

В этом плане проблемы совершенно иные. Но это тема отдельного разговора.

Николай КОВШ, кандидат педагогических наук, член Национального комитета Объединенной гражданской партии.

Брест.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

Баран — для мусульман, а для славян — кабан

Еўрапейцы апошнім часам абураюцца, што ім у крамах пад выглядам ялавічыны прадаюць каніну. Карэспандэнты "Еўрарадыё" прайшліся па Камароўцы, дзе ім адно і тое ж мяса гандляры таксама прапаноўвалі як свініну, ялавічыну і каніну...

У дзень асенні, на Пакровы,
Калі зямлю пакрыў сняжок,
Прыплод з'явіўся ад каровы —
Як снег той, беленькі бычок.
У ладкі пляскалі Палажка
І чалавек яе Хвядот:
Бюджэт папоўніцца — і важка! —
Як вырасце бычок праз год.
Каб збыцца спадзяванням гэтым,
Бычку Хвядот сярод зімы
(Тым болей сакавітым летам)
Даваў належныя кармы.
Прынамсі, не прайшло і года,
Спазнаўшы не жыццё, а рай,
Бычок зрабіўся, як калода.
Дый не бычок ужо — бугай!
На бойню бугаю дарога...
Ну а затым жа, як і след,
Загад Палажкі для старога:
— Вязі на рынак мяса, дзед!
Вакзал. Сталіца. Камароўка.
Паўсюль гандляркі-гандляры
Арудуюць нажамі лоўка.
— Не мяса — цуд! Купляй-бяры!
Купцы скіроўваюць пагляды
І на Хвядота:
— Ну, дзядок,
Ці свежы твой прадукт з гавяды?
— Учора бегаў мой бычок!
Аднак, на гора для Хвядота,
У дзень той дрэнна йшлі "бычкі".
Таму да дзеда без ахвоты
Завітвалі пакупнікі.
— Каб у цябе была свініна,
Дык быў бы іншы каленкор.
Свіння — яда для славяніна. —
Хвядоту кідалі ў дакор.
Чым дзед Хвядот, засведчыць неба,
У вёсцы не было хітрэй.
І ён дапетрыў: "Мусіць, трэба
Зусім іначай весці рэй..."
— А мяса ў вас каго? — бывала,
Цікавіўся які прафан.
І дзед Хвядот раздумваў мала:
— Учора бегаў мой кабан!
Хвядоту аддадзім даніну:
Хлусіў — не моршчыўся стары.
І хтось купляў яго "свініну" —
Ці два кіло, ці нават тры.
Калі ж да прайдзісвета-дзеда
Завітваў нехта з мусульман,
Што адказаць, таксама ведаў:
— Учора бегаў мой баран!
Да дзеда падыходзіў часам
Мангол ці іншы азіят.
Цікавіўся ён конскім мясам,
Маўляў, яго купіць бы рад.
Хвядот даводзіў азіяту,
Яму падсунуўшы далонь,
Каб атрымаць за мяса плату:
— Учора бегаў гэты конь!
Было, што выпадкова неяк
Да дзеда зазірнуў яўрэй.
І, мусіць жа, таксама невук:
— А гэта мяса не з курэй?
Дзед не разводзіў шуры-муры:
— Хіба адразу не відно?
Вядома ж, гэта мяса куры.
Яшчэ й кашэрнае яно!
Працэс ішоў усё-ткі слаба:
Ну, кілаграм, ну, паўтара...
За жменьку грошай злая баба
Хвядота выгане з двара.
Зусім у роспачы стары быў:
"Во даўся бык у знакі мне...
Ну што рабіць?"
Прадаў як рыбу.
Прынамсі, па такой цане.

* * *

Я не здзіўлюся, калі заўтра
Па тысяч сто за кілаграм
На рынках мяса дыназаўра
Хтосьці прапаноўваць будзе нам.

МАХЛЯРСТВА

Лічыце грошы!

Думаю, што многія траплялі ў тую ж сітуацыю, у якой днямі апынулася і я. Пайшла на рынак, маючы ў кашальку буйныя купюры. Амаль нічога не купіла, а з грошай засталася — адна драбяза.

Я і так лічыла, і гэтак, але выходзіць, што ніяк не магла я патраціць тыя 200 тысяч рублёў. Пачала ўспамінаць, што, дзе і як я купляла, колькі што каштавала, якімі купюрамі мне давалі рэшту... І зразумела методыку падману. Яна простая. Вы разлічваецеся буйной купюрай, а вам на рэшту даюць жменю драбязы. Часта такое бывае? Вельмі часта. І калі чалавек стаіць, пералічвае грошы, нягледзячы на тое што іншыя пакупнікі піхаюць яго ў спіну, то прадавец таксама пачынае варушыцца і дадае вам самае буйное з рэшты. Нібы так і задумана было — спачатку што драбней, а ўжо потым галоўнае. А задумана было якраз самыя буйныя купюры і недадаць.



Напрыклад, я ўжо разумею, што менавіта з дапамогай такога псіхалагічнага трука мне недадалі 100 тысяч рублёў. Розных дробных паперак — паўкашалька надавалі, але за тымі пяцісоткамі, тысячамі і пяцёркамі самыя буйныя грошы я і не адшукала.

Размаўляла з суседкамі — высветлілася, што ў кожнай бывалі такія гісторыі.

Вольга Сяргееўна МАЙСТРУК.

Мінск.

ЭХО

Почему он не назвал себя?

Прочла заметку "Верность друга по имени Барсик" (от 29.03.13 г.) и разволновалась до глубины души. Автор пишет о том, что меня никогда не оставляет равнодушной, — о преданности человеку его четвероногого друга. Жаль, под письмом в редакцию нет имени автора. И почему он не решился это сделать? Может, чего-то побоялся? Но чего?

По-моему (и скорее всего), он вот чего побоялся: в глазах у знакомых выглядеть чересчур эмоциональным: надо же, так собаку жалел... Ведь в нашем обществе, и это не секрет, постоянно нагнетается градус агрессивности по отношению к беспомощным животным. То и дело слышим и читаем в разных СМИ о том, что вроде где-то собаки кого-то покусали, на кого-то напали и т.д. и т.п. И в результате общественность пылает "праведным гневом": мол, всех их надо уничтожить, отстрелять, отравить... (В Гомеле, например, — недавней "культурной столице" страны и СНГ — их убивали током. И общественность города ничуть не возмущалась.)

Нам постоянно навязывают жестокость к животным, и особенно — к бездомным. Вместо того чтобы наказывать тех, кто их бездомными делает, то есть — нерадивых хозяев. Видимо, это удобнее, чем проводить массовое чипирование животных (как во многих странах), и вообще осознать, что подобное отношение "воспитывает" в человеке не лучшие качества. Рост жестокости — преступной жестокости и в моральном, и в прямом криминальном смысле — выходит, никого не волнует. Зато, по всей видимости, очень волнует уровень заработка службистов по отлову и уничтожению бездомных собак и кошек. У них ведь есть свой производственный план. За его перевыполнение они получают еще и премии (деньги, как известно, не пахнут).

Может, поэтому не отважился выставить напоказ свои нормальные, добрые человеческие чувства гражданин страны, где входят в норму антигуманные проявления, пагубно влияющие на взрослых и детей.

Розалия РУБИНЧИК, жительница Минска.

ТАКОЕ ЖЫЦЦЁ

Калючка

Вестку пра тое, што памёр яе брат Аркадзь, Зіна Тушэўская з вёскі Кулінкі (імёны людзей і назва населенага пункта зменены) пачула ад суседкі Надзеі Варанок:

— Бяры ровар і хутчэй едзь на сенажаць! — казала ёй Надзя. — Ваш Аркадзь грузіў катушкі сена на трактар, раптам выйшаў з пагрузчыка і паваліўся. Фельчар Казіміравіч, якога механік прывёз на поле, сказаў, што ратаваць няма каго: маўляў, чалавек ужо мёртвы... Прычыну смерці скажуць тады, як разрэжуць.

— Ведаю я гэтую прычыну! — выцягваючы з павеці ровар, крычала Зіна. — Давяла майго брата да смерці жоначка ненаглядная Віцця, каб ёй свету не бачыць!

Клянучы братаву і галосячы на ўсю вёску, паехала на сенажаць.

— Змяя, кажаш, — мовіла, гледзячы ёй услед, Надзя. — Сама ты змяюка, нездарма ж у вёсцы за злосць і нялюдскасць змяюкай празвалі.

Братаву Зіна ўзненавідзела з першага погляду, калі Аркадзь пазнаёміў іх і сказаў, што неўзабаве ажэніцца з гэтай чарнавокай дзяўчынай. Каб хто спытаў у Зіны, за што яна так не любіць маладзіцу, то, мабыць, і адказаць толкова не змагла б. Можа, таму, што прыгожай была, не тое што Зіна — худая, нязграбная, вечна нечым незадаволеная. А можа, таму, што зажылі яны з Аркадзем, так бы мовіць, душа ў душу: дом сабе пабудавалі, абставілі, машыну купілі. Зіна ж у адзіноце дажывала свой век, бо муж Антон ужо даўно пакінуў яе і перайшоў жыць у суседні гарадок да ўдавы з двума дзецьмі. Сын Віця закончыў у Гомелі ўніверсітэт, там і застаўся. Калі ажаніўся, то прыехаў у родную хату са сваёй Анютай, хацеў пазнаёміць з мамай. Ды мама так сустрэла маладую нявестку, што тая тут ледзь ноч пераначавала, а назаўтра разам з Віцем паехалі назад.

— Чаму ж у цябе дзеці не пагасцілі? — пыталі суседкі. — Ні свет, ні зара выбеглі.

— Няхай бягуць! Прывёз нейкую няўмеку, ні Богу свечка, ні чорту качарга. Кажу ўчора вечарам: ідзі, падаі карову. А яна вочы вылупіла, нібы я загадала месяц з неба дастаць. Так і не пайшла.

— Ці ёсць у цябе сумленне? Сама ж казала, што дзяўчына нарадзілася і вырасла ў горадзе, адкуль ёй ведаць, як да той каровы падступіцца.

— Не патрэбна мне ў хаце няўмека. І бачыць больш не хачу!

Яна больш і не бачыла. Ні сын, ні тым больш нявестка ніколі да Зіны не наведваліся і не званілі, хоць мінула ўжо сем гадоў. І яна імі не цікавілася.

— Можа, у цябе і ўнукі там ёсць? — неяк сказала Надзя. — А ты і не ведаеш...

— І ведаць не хачу!

Пахавалі Аркадзя, справілі саракавіны, і да забітай горам Віцці ледзь не кожны дзень пачала наведвацца Зіна з адным пытаннем: калі братава сплаціць грошы за хату?

— За якую хату?! — напачатку здзівілася Віцця.

— А за гэту, у якой ты жывеш! Яе ж мой брат будаваў. Дзяцей у вас няма, то палова гэтай хаты належыць мне!

Аднойчы восеньскім надвячоркам, калі Зіна прыйшла зноў, Віцця ўзяла дзяркач і праперла яе з двара:

— Вон! Каб я цябе больш тут не бачыла! Прыйдзеш яшчэ раз — у міліцыю заяўлю. Маеш сваю хату і жыві ў ёй, а да мяне не лезь. І без цябе белы свет не мілы...

— Ну, пачакай жа! Я зраблю так, што і табе тут жыцця не будзе. І нідзе не будзе! Вось пабачыш.

У вёсцы навіны на адным месцы доўга не ляжаць.

— Чулі, бабы, Калючка патрабуе ў Віцці грошы, маўляў, за палову хаты павінна заплаціць, — казала суседкам Надзя.

— Ражна ў бок яна не хоча? Увесь свет праглынула б, ды горла вузкае!

А ў Зіны ўжо быў план, як адпомсціць братавай:

— Не будзе мне карысці ад хаты, то і табе не будзе, — бубніла сабе пад нос. — Я ведаю, што трэба зрабіць.

Цёмнай лістападаўскай ноччу, калі ўся вёска спала моцным сном, яна ўзяла ў паветцы каністрачку з бензінам, абула гумовыя боты, замкнула хату і пайшла агародамі ў той канец вёскі, дзе стаяў дом брата. Радавалася, што так цёмна наўкола, што ніхто яе не бачыць і не чуе. Паціху адчыніла веснічкі, што вялі з агарода на падворак, прыслухалася. Нідзе нікога. Пракралася да тыльнай сцяны дома, адкруціла накрыўку ад каністрачкі. Раптам наступіла на нейкі камень, і бензін расплюхаўся раней часу, яго пах даў у ноздры.

— Вось разява, — падумала сама сабе. — Магла паваліцца, і ўся справа сарвалася б.

Узяла каністрачку зручней і лінула на сцяну, потым яшчэ і яшчэ. Не шкадавала, каб ужо быць упэўненай, што згарыць хата і жонка брата.

— Разам з дымам паляціць у неба твая душа! — радавалася так, нібы рабіла добрую справу. Намацала ў кішэні старой курткі карабок запалак. Чыркнула, і дзікі крык узарваў начную цемру. Полымем узялася сцяна, а разам з ёй і сама Зіна. Спяшаючыся і баючыся (усё ж рабіла грэх) яна не заўважыла, як, аступіўшыся на камень, наліла бензіну сабе ў гумовы бот. Гарачае трапіла і на куртку, і на спадніцу. Жывым факелам яна бегала па надворку і выла так, што, можа, было чуваць у небе. Потым пачала качацца па роснай пажухлай траве.

Калі на пажар прыбеглі людзі і ўбачылі нерухомае цела, ад страху і нечаканасці аслупянелі. Потым кінуліся ратаваць:

— Віцця згарэла! — галасілі бабы. — Бедная, такое гора!

— Не можа быць, каб Віцця. Яна ж пад вечар паехала ў Мінск да сястры. Я сам бачыў, як садзілася ў аўтобус, — сказаў дзед Мікола Жырынскі.

— Людзі, гэта ж Калючка! — пазналі кабеты. — Памерла ўжо ад апёкаў...

— Хадзіла ўсё па грошы за хату, а потым вырашыла спаліць і хату, і Віццю.

Пахавалі Зіну вяскоўцы, бо ні муж, ні сын з нявесткай на пахаванне не прыехалі. Сыну не паведамілі, бо ніхто не ведаў яго каардынат, а муж не хацеў бачыць яе ні жывой, ні мёртвай.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

Дзятлаўскі раён.

У СУСЕДЗЯЎ

У бібліятэках можна вывучыць англійскую мову і атрымаць параду ад дыетолага

Амаль 500 бібліятэк Польшчы выйшлі ў фінал “Праграмы развіцця бібліятэк”. Для жыхароў вёсак і мястэчак гэта азначае лепшы доступ да камп’ютараў, інтэрнэту і кваліфікаваных бібліятэкараў.

Усе 500 бібліятэк, якія ўдзельнічаюць у праграме, атрымаюць новае камп’ютарнае абсталяванне, а іх супрацоўнікі пройдуць курсы павышэння кваліфікацыі.

У сімвала Варшавы твар дзяўчыны з беларускага Палесся

У сімвала польскай сталіцы, славутай варшаўскай русалкі, твар дзяўчыны з беларускага Палесся. Натуршчыцай пры стварэнні скульптуры, якую ў 1939 годзе ўстанавілі на беразе Віслы, была ўраджэнка вёскі Мазуркі, што пад Баранавічамі, **Крысціна Кагельская.**

Крысціна нарадзілася ў 1914 годзе ў сям’і памешчыкаў. Маці Яніна была біёлагам і доктарам філасофіі. Бацька Ян — інжынерам, з 1926 года быў палескім ваяводам. Дзед удзельнічаў у паўстанні Каліноўскага і быў за гэта высланы ў Сібір.

Пасля заканчэння гімназіі імя Рамуальда Траўгута ў Брэсце Крысціна вывучала геаграфію і этнаграфію ў Варшаўскім універсітэце. Пісала вершы, спявала свае песні. У яе рэпертуары было шмат беларускіх народных песень, якія яна выконвала ў эфіры Польскага радыё ў Вільні і Варшаве.

У палове 1930-х маладую студэнтку і паэтку заўважыла скульптар **Людвіка Нітшова,** якая прапанавала ёй папазіраваць падчас стварэння сімвала Варшавы.

Дарэчы, гэтая скульптура была адзіным помнікам, які ацалеў у сталіцы пасля Варшаўскага паўстання, удзельніцай якога была і Крысціна Кагельская. Яна загінула 2 жніўня 1944 года, на другі дзень паўстання. Яе імем названа адна з варшаўскіх школ.

Польскі электрамабіль

У Варшаве прадстаўлены прататып польскага электрамабіля. Навінка распрацавана спецыялістамі Агенцтва рэгіянальнага развіцця горада Мелец. Элементы электракара праектавалі польскія інжынеры і вырабілі выключна польскія фірмы.

Электракар прызначаны для чатырох чалавек. Зарадка акумулятара працягваецца 6—8 гадзін, на поўным акумулятары можна праехаць да 150 кіламетраў. Паводле сцвярджэнняў аўтараў праекта, найбольшым плюсам электрамабіля з’яўляецца нізкі кошт эксплуатацыі: праехаць 100 кіламетраў каштуе крыху больш за адзін еўра.

ТАМ, В ВЕНЕСУЭЛЕ

С минимальным перевесом выиграл Николас Мадуро

По предварительным подсчетам, временно исполняющий обязанности главы государства **Николас Мадуро** набрал 50,76% голосов, его основной соперник, кандидат от оппозиции **Энрике Каприлес,** — 49,07%.

Известие о победе Мадуро обрадовало его сторонников — они принялись запускать фейерверки, и привело в неистовство его противников, заподозривших подтасовки при подсчете голосов. В знак протеста люди, поддерживающие Каприлеса, вышли на улицы Каракаса с домашней утварью — они принялись громко бить в кастрюли и сковородки.

В связи с накалившейся обстановкой Николас Мадуро в обращении к нации призвал сограждан к спокойствию, заявив: “Мы не хотим насилия, мы хотим мира”. Он также обратился к Национальному избирательному совету с просьбой проверить результаты голосования.

В свою очередь кандидат от Блока демократического единства Венесуэлы Энрике Каприлес отказался признать итоги выборов. В первом заявлении перед своими сторонниками после объявления результатов голосования он потребовал провести тщательный пересчет голосов избирателей.

Право голоса в Венесуэле имеют почти 18,9 миллиона человек — по предварительным оценкам, им воспользовались более 14 миллионов. Около 100 тысяч венесуэльцев проголосовали за рубежом.

Победа Николаса Мадуро озвучена. Была ли она на самом деле?



"Начиная половую жизнь, молодые люди не знают, что и как нужно делать, — рассказывает психолог **Андрей Трембицкий**. — *Что нормально, а что не является нормой? Слишком много существует видеоматериалов, где половой акт длится часами. Ну а в норме он занимает от полутора до шести минут...*"

Интересный факт: у взрослых мужчин страхов куда больше, чем у юношей. Так ли я силен, как раньше? Могу ли я соответствовать? Подобные мысли мешают сосредоточиться на главном.

"Для удачного полового акта нужно чувство возбуждения, — поясняет Трембицкий. — *Ну а если человека отвлекают другие мысли, то успеха не будет. Иногда человек так зацикливается на значимости собственной потенции, что это приводит к обратному результату*".

Нередко в мужских проблемах виноваты женщины. Сильный пол импотенцией может противостоять попыткам манипуляции. Например, когда дама непрозрачно намекает, что на интим согласится только при выполнении определенных условий. И какие это будут условия — новая шуба или забитый гвоздь, для мужского сознания не важно.

"Эректильная дисфункция — только симптом, — замечает специалист. - *И, как любой симптом, он несет в себе некий позитивный смысл. Он говорит о том, что есть проблема. Но пока мы не преодолеем этот внутренний кризис, восстановить половую функцию будет крайне непросто"*.

КСТАТИ

Импотенция — женская проблема?

Дамы подвержены расстройству сексуального желания куда чаще, чем мужчины, но до недавнего времени эту проблему и проблемой-то не называли...

К счастью, сегодня врачи и фармацевты стремятся одинаково позаботиться и о мужчинах, и о женщинах. Существует много возможных причин импотенции у леди. Это могут быть физические, гормональные и психологические факторы. В некоторых случаях специалисты советуют принимать специфические препараты. Вот только белорусские аптеки не могут похвастаться разнообразным выбором аналогов дамской "Виагры".

Между тем в скором времени немецкие производители обещают завезти на белорусский рынок препарат, который поможет женщинам ощутить прилив страсти. Мужской вариант этой биологически активной добавки "Доровит" уже продается в аптеках. Правда, выложить за такие "таблетки страсти" придется астрономическую сумму — около полумиллиона рублей за две капсулы. Вряд ли женские пилюли будут дешевле. Многие ли белоруски согласятся ощутить прилив сексуального желания за такие деньги?..

Сергей ШЕЛЕСТ.

ШОУ-БІЗНЕС

Мікалай Фаменка і Максім Леанідаў адсвяткуюць у Мінску 30-годдзе

24 красавіка ў Палацы Рэспублікі пройдзе юбілейны канцэрт біт-квартэта "Сакрэт". Лепшыя песні калектыву прагучаць у жывым выкананні "залатога" складу: Максіма Леанідава, Мікалая Фаменкі, Андрэя Заблудоўскага і Аляксея Мурашова.

Самы рамантычны калектыў савецкай рок-сцэны, што дасягнуў поспеху ў сваім класічным складзе "біт-квартэта", вобразна і музычна выклікае асацыяцыі з The Beatles — чацвёра абаяльных хлопцаў з Ленінграда літаральна перавярнулі музычную прастору свайго часу. Іх песнямі жылі, іх спявалі, пад іх танцавалі і кахалі — "Привет", "Моя любовь на пятом этаже", "Сара Барабу".

Удзельнікі групы "Сакрэт" не толькі выпусцілі шэраг кружэлак, якія разышліся мільённымі тыражамі, але і арганізавалі рок-тэатр-студыю "Сакрэт", дзе паставілі спектакль "Кароль рок-н-ролу" аб Элвісе Прэслі, бралі ўдзел у дзясятках тэлепраграм, частку з якіх самі і прыдумалі.

У 1990 годзе "Сакрэт" пакінуў Максім Леанідаў, затым сышоў і Мікалай Фаменка. У іх з тых часоў свае маштабныя праекты, таму калектыў выступае ў арыгінальным складзе вельмі рэдка, але кожны раз збірае аншлагі. Акрамя Мінска "Сакрэт" дасць юбілейныя канцэрты ў Санкт-Пецярбургу, Кіеве, Рызе, а таксама дасць адразу два канцэрты ў маскоўскім Crocus City Hall.

Кошт квіткоў ад 410 тысяч да 1 мільёна 510 тысяч беларускіх рублёў.

Аліна ВЕТРАВА.



С МОЕЙ КОЛОКОЛЬНИ



Елена МОЛОЧКО

Дворник — он тот же профессор. Своего профиля

Это катастрофа! В Минске не хватает почти половины дворников. Точная цифра, правда, чуть меньше — есть 7 тысяч работников на 10 тысяч вакантных мест. Но если учесть, что немалая часть из них по вековой традиции попивает, то получится, что недостает как раз половины кадров. А сейчас особенно очевидно, как город нуждается в рабочих руках, кто именно на несколько недель станет у нас (да и по всем городам Беларуси) на улицах главным. Конечно, он — дворник, мусорщик. Или креативщик чистоты, как сказали бы продвинутые.

Оглянитесь вокруг: такой грязи, как после этой долгоснежной, практически без оттепелей зимы, Минск не видел давно. Таких потерь наша столица давно не терпела: дорогая тротуарная плитка местами раскрошена буквально в крупу, асфальтированные дороги зло выщерблены, как после бомбежки, фасады зданий шелушатся, как нездоровые пятки у бомжей. А уж мусора: миллионы окурков, килограммы целлофана, тонны песка... Опять же собачьи какашки — когда наконец власти города начнут штрафовать хозяев животных за оставленные их любимцами на газонах нечистоты? Ведь по-другому, как только денежными взысканиями, людей не заставишь убирать.

Вообще, деньги и чистота, как показывает опыт, находятся друг с другом в сильном магнитном притяжении. Есть средства — моют тротуар шампунем, как в Германии. Нет — ждут майских гроз. Как в Беларуси. Есть хорошая зарплата у дворника — он на рабочем месте. Нет — ау, жди коммунистического субботника, как подаяния. Как и ждут его в тысячах дворах и подъездах Минска, где дворники уволились, потому что за 1 миллион с небольшим в месяц работать безнравственно. Это не зарплата — это пособие по безработице.

Наша дворничиха тоже помахала ручкой ЖЭУ-7 Советского района. Теперь Аня убирает узенькую полоску тротуара под окнами одной фармацевтической фирмы, расположенной в нашем же здании. Полагаю, за большие деньги и за очевидно меньшее время. Причем она всякий раз назидательно обходит стороной наше крыльцо, оставляя на нем снег, а теперь окурки и песок. Не ее территория. Я не думаю, что Аня мстит нам, жильцам. Нет. Она нас, а также свое бывшее начальство учит жизни и рыночным отношениям. Спасибо, Аня!

Так сколько же нужно платить, чтобы люди шли в дворники? Три миллиона? Но почти столько же — 3.500.000 рублей в месяц — получают в АН РБ доктора наук. Может ли дворник столько же зарабатывать? Даже так поставлю вопрос: имеет ли право он, человек физического труда, приблизиться в доходах к ученым?

Мое мнение — может, имеет, должен. Мне кажется, что в нашем сверхтехнологичном веке, когда ученость — явление массовое и порядком девальвированное, именно "простые" профессии приобретают неоценимое значение. Да, собственно, и сейчас они порой приносят их обладателям гораздо больший доход, чем тем, у кого за плечами вуз и аспирантура. Например, сиделка, парикмахер, повар, сантехник, таксист. Про строителей вообще не говорю. Вот и в высшие учебные заведения государство уменьшает набор учащихся с этого года — общество явно перегружено "докторами" чего бы то ни было. И, кстати, на ярмарках вакансий организации с частным капиталом (без штатного расписания, на которое надо "молиться") заявляют для дворников именно "докторскую" сумму заработка — от 3.000.000 рублей и даже от 3.200.000.

Но вернемся в низы, в ЖЭСы, ЖРЭО и т.д.: откуда же им брать средства для порядочных зарплат дворнику? Из бюджета вряд ли выдавишь. Не открою Америку: из кошельков квартиросъемщиков. Болезненное мероприятие. Но если захотим жить в чистоте и уважении к самим себе — будем выкраивать и доплачивать. Как во всем мире. В квартплату на Западе входят не только коммунальные расходы и вывоз мусора, но и отдельной строкой — работа нанятого человека по уборке подъездов, территории около дома, уход за клумбами, стрижка газонов.

И если вы думаете, что Минск стоит где-то за тридевять земель от этого процесса, то ошибаетесь. Уже в прошлом, 2012, году минчане вложили около 2 млрд рублей собственных средств в благоустройство своих дворов. Покупали цветочницы, скамейки, делали парковки, ремонтировали свои подъезды. Естественно, на добровольной основе. Что ж, от жизни не отмахнешься, иначе завалит нас собственными отходами и ученый вопрос "Как пройти в библиотеку?" отпадет сам собой. Конечно, я немного утрирую, но лишь немного. А зная, что в наших с вами карманах пока все-таки не густо — в одном смеркается, в другом заря занимается, — лозунг "Все на коммунистический субботник!" считаю на сегодняшний день более чем актуальным. Как говорится, прежде чем изменять страну, приведи в порядок свой двор.

СМАЧНА ЕСЦІ!



На нажах: журналісты супраць блогераў

Журналіст "Народнай Волі" брала ўдзел у кулінарным паядынку.

У межах праекта "Гатуем з "Рэстарацыяй" прайшла пятая кулінарная бітва. На гэты раз на кухні школы-студыі Oede сышліся журналісты і блогеры.

Сярод прадстаўнікоў абедзвюх каманд не было ніводнага прафесійнага кулінара, і тым цікавей было спаборніцтва — па ўмовах конкурсу, удзельнікі павінны былі прыгатаваць мінімум тры стравы: закуску, гарачае і дэсерт.

У кожную каманду ўвайшлі тры чалавека. Блогераў прадстаўляла пераможца конкурсу "Смак вясны" кампаніі "Рэстарацыя" **Анастасія Статкевіч**, блогер, намеснік галоўнага рэдактара газеты "Транспартны веснік" **Юлія Бекер**, блогер і рэдактар партала аб беларускай модзе Pret-a-portal.by **Вольга Жадзеева**.

У каманду журналістаў увайшлі спецыяльны карэспандэнт газет "Вечерний Минск" і "Минский курьер", вядучая рубрыкі "Гурман" **Ірына Сцех-Санкевіч**, журналіст Telegraf.by **Арына Лісецкая** і рэпарцёр "Народнай Волі" **Марыя Малевіч**.

Перад кожнай камандай стаяла адна задача — з набору прадуктаў прэміум-класа, што прадаставіла кампанія "Рэстарацыя", выбраць 15 неабходных. Ну а з іх ужо трэба было стварыць яркія, смачныя і здаровыя стравы. Прычым апошні крытэрый быў вельмі важны — тэма конкурсу гучала як "Здаровае харчаванне".

Ацэньвала кулінарныя намаганні ўдзельнікаў конкурсу журы, у склад якога ўвайшлі заснавальнік партала Oede.by і кулінарнай школы-студыі Oede **Алена Высоцкая**; шэф-повар клуба "Dozari" **Дзмітрый Вярбенка** і дацэнт кафедры агульнай гігіены Беларускага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта **Пётр Новікаў**.

Дзве гадзіны пад пільным вокам журы і гасцей канкурсанты ажыццяўлялі свае кулінарныя фантазіі. У выніку высветлілася, што журналістам і блогерам няма чаго дзяліць — узровень кухарскага майстэрства ва ўсіх аднолькавы. Таму ў конкурсе была аб'яўлена сяброўская нічыя.

Сяргей ШЭЛЕСТ.

ПРОБЛЕМА

Невидимые миру слезы

В Беларуси открыта детская линия помощи— 8-801-100-1611. Бесплатно. Круглосуточно



Защита детей в сложных жизненных ситуациях — одна из немногих тем, где общественное участие, считают специалисты, до сих пор является недостаточным. Когда дело касается пропавших детей или ребенка, подвергающего насилию в семье, лишнего внимания со стороны взрослых быть не может. Но участие волонтеров не должно быть, конечно, хаотичным и дилетантским, любое вторжение в эту область требует специальных знаний. Поэтому не так давно при международном общественном объединении **"Понимание",** который работает в Беларуси с 2000 года, создан еще и центр содействия розыску пропавших и эксплуатируемых детей. Наша беседа с исполнительным директором объединения **Андреем МАХАНЬКО** и директором центра **Андреем СОЛОДОВНИКОВЫМ**.

— Андрей Михайлович, в государстве проблемами детей занимаются педагоги и милиция: в каждом районе есть комиссии по делам несовершеннолетних, в РУВД есть инспекции. Есть социально-педагогические центры, психологические службы в школах. Каково место вашего общественного объединения в этой системе?

— Прежде всего наш фонд "Понимание" встраивает в социально-педагогические центры совершенно новое звено, которое позволит всей цепочке работать более эффективно. Это общенациональная **бесплатная телефонная детская линия — 8-801-100-1611**. Она открыта в Беларуси в июле 2011 года. Дети могут звонить с любого проводного телефона на территории Беларуси и с мобильного МТС. Рассказать о проблеме и получить помощь.

— И она эффективна? Дети действительно ею пользуются?

— Да, звонят и очень часто. За 2012 год по "Белтелекому" мы получили 1556 звонков — примерно 100 звонков в месяц. Больше всего звонили из Минска, Минской области. А также из Бреста, Могилева. И это при том, что у нашей "горячей линии" мало рекламы. Афишки мы напечатали, разослали, они висят в каждой школе. Но не всегда ребенок посмотрит на этот листок. Вместе с Министерством информации мы сейчас обсуждаем возможность публикации в каждом номере каждой районной газеты на 10 квадратных сантиметрах рекламного блока: *"Детская линия помощи — 8-801-100-1611. Бесплатно. Круглосуточно"*.

— А ребенок не пользуется ею, чтобы шаблонно пожаловаться на учителей?

— Пускай. Мы разбираемся. Вся история мировых исследований насилия над детьми (особенно тяжелого физического или сексуального насилия) показывает, что если ребенок об этом рассказывает, то в 95—99 процентах случаев он говорит правду. Конечно, бывают конфликтные межличностные отношения... Но здесь также нужна помощь.

— Но если вы убеждаетесь, что это не просто проблема с дискотекой, на которую не пускает мама, а насилие, каковы ваши действия?

— Сначала оператор-психолог оценивает, насколько это криминальный случай. Если это так, то его задача обязательно уговорить ребенка (или взрослого, они тоже звонят) срочно обратиться в милицию, чтобы к насильнику были приняты меры пресечения. Сообщения с нашей детской "горячей линии" в дежурных частях милиции висят с красным восклицательным знаком — то есть для мгновенного реагирования.

— Итак, мы имеем звонок. Как дальше работает "Понимание"?

— Дело в том, что дальше за дело берется человек в форме. Он профессионал, которого учили ловить преступников, получать показания, собирать улики. Он многое умеет. Но часто не знает, как разговаривать с ребенком, потому что у него в академии было всего 4 часа детской психологии. Поэтому у милиционера и следователя есть прекрасная возможность пригласить нашего психолога для участия в следственном или доследственном действии с участием несовершеннолетнего. И, как правило, они звонят в СПЦ и приезжают вместе с пострадавшим ребенком в специально оборудованную, как мы говорим, дружественную детям комнату опроса: диван, два кресла, пастельного цвета стены, иногда большая мягкая игрушка. Во время опроса наши специалисты помогают сохранить ребенку его психику более-менее нетронутой. Конечно, травма есть в любом случае, наша задача — минимизировать ее.

— Официальные структуры без вас, вы считаете, не справятся?

— Дело в другом. Мы, взрослые, иногда очень самоуверенны, а любое воспоминание о драматичном событии для ребенка есть повторная травма. На базе очень богатого мирового опыта существуют профессиональные программы, например такие, как "Десять шагов опроса ребенка". Задача взрослого — получить качественную, достоверную информацию от ребенка, как можно меньше заставляя его страдать.

— Интересно, когда ребенок убегает из семьи, то куда прежде всего держит путь? На вокзал?

— В принципе, на вокзал — это хорошо, — *присоединяется к беседе директор центра содействия розыску пропавших и эксплуатируемых детей МОО "Понимание"* ***Андрей Солодовников.*** — Транспортная милиция — одно из боеспособных подразделений органов внутренних дел. Убежать на вокзал — значит, сразу попасть под наблюдение, тебя быстро вычислят. Страна у нас небольшая, но проблема с пропавшими — серьезная. В прошлом году органами внутренних дел зарегистрировано более 2229 заявлений о безвестном исчезновении детей. Но я предполагаю, что цифра выше. Есть часть родителей, которые не обращались в милицию, потому что ребенка, возможно, быстро нашли. Сегодня в стране 58 неразысканных детей. Из них 38 детей не могут найти уже более 5 лет. Значит, шансов уже почти нет... Цифра накапливается. Кто-то, возможно, стал жертвой тонкого льда... Но подавляющее большинство детей разыскиваются в первые сутки, максимум — через три.

— Каковы причины бегства детей из семьи?

— Причин несколько, и первая — весна. Да, путешествия манят мальчишек. Уходят, строят шалаши, "скворечники"... Но всегда к романтике примешиваются и семейные моменты. Есть родители недалекие. Или слишком далекие от детских проблем: "Давай-давай! Оценки-оценки!" В школе непонимание педагогов, а еще и дома: "Негодяй!.." Есть просто неуправляемые бегунки — как правило, это инфантильные подростки. Бывают и патологические путешественники — дромоманы. Ну, а есть криминальные исчезновения. К счастью, мизерная часть от общего числа. Кстати, пропавший ребенок, возвращенный в семью, прежде всего тоже попадет к нам на опрос, где мы выясним, что стало причиной побега? Это никакое не расследование, а беседа. Но тем не менее он войдет в нашу систему и ему будет оказана психологическая помощь.

Елена ШАТРОВА.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Хто захоча — той і ў Біблii ўбачыць парнаграфію

Ці могуць фотаздымкі ўтрымліваць "домыслы"? Упраўленне КДБ па Гродзенскай вобласці спрабуе праз суд даказаць, што на фотаздымках з альбома "Прэс-фота Беларусі" зафіксаваны менавіта "домыслы" пра наша жыццё.

Нагадаем: мінулай восенню 41 асобнік фотаальбома "Прэс-фота Беларусі 2011" не здолеў пераехаць літоўска-беларускую мяжу — выданне канфіскавалі мытнікі. Хаця раней у Беларусь гэтыя альбомы ўвозіліся афіцыйна, для чаго былі зроблены ўсе неабходныя дакументы, і прадаваліся ў некаторых кніжных крамах. Цяпер у канфіскаваных альбомах эксперты, прызначаныя па просьбе КДБ, знайшлі "мэтанакіравана змененыя, не адпавядаючыя рэчаіснасці здагадкі аб жыццядзейнасці Рэспублікі Беларусь". Фотаальбом праз суд хочуць прызнаць экстрэмісцкім. На 17 красавіка Юлію Дарашкевіч выклікалі ў суд Ашмянскага раёна.

Як паведаміла Юлія Дарашкевіч, экстрэмізм знайшлі нават у рубрыках "Спорт" і "Прырода". Суд, дарэчы, будзе закрытым.

ТЫМ ЧАСАМ

"Сітуацыя абуральная"

Вядомыя фатографы, якія ўваходзілі ў журы фотаконкурсу "Прэс-фота Беларусі-2011", лічаць прэтэнзіі КДБ да выбраных імі здымкаў неабгрунтаванымі.

Рустэм Адагамаў — фотарэдактар LiveJournal, вядомы расійскі блогер: "Я быў сябрам журы гэтага конкурсу і не магу лічыць, што якія-кольвек фотаздымкі, прадстаўленыя на ім, можна аднесці да так званых экстрэмісцкіх. Фотажурналістыка — гэта наогул толькі адлюстраванне таго, што адбываецца ў грамадстве. 2011 год быў для Беларусі вельмі напружаным у сувязі з выбарамі, і няма нічога дзіўнага, што большасць работ, прадстаўленых на конкурс, была прысвечана грамадзянскай актыўнасці ў час выбараў.

Фатограф толькі фіксуе падзею, застаючыся бесстароннім сведкам. Разам з тым сярод прызёраў конкурсу былі і фатографы, якія здымалі спартыўныя падзеі і кранальныя жанравыя сцэны, такія як фотасерыя Сяргея Бібікава пра каня Каштана з г.Шчучын, асабліва адзначаная мной, — гісторыя каня, які шмат гадоў развозіў прадукты па крамах, кафэ, дзіцячых садках і памёр проста на вачах фотакарэспандэнта (2-е месца ў серыі "Паўсядзённае жыццё". — **Рэд.**)...

Адным словам, я быў вельмі рады такой колькасці выдатных фатографаў у Беларусі і ўзроўню прадстаўленых на конкурс работ. Ні ў якім выпадку не магу аднесці іх да экстрэмісцкіх альбо такіх, якія неяк закранаюць існуючы ў Беларусі рэжым. Усё гэта — толькі адлюстраванне паўсядзённага жыцця ў вашай краіне".

Ганна Зекрыя, выканаўчы дырэктар агенцтва Salt Images, агент Magnum Photos, Agentur Focus, Grazia Neri, Panos Pictures і GalleryStock у Расіі і краінах СНД:

"Усё гэта выглядае абсалютным бязмежжам. Зразумела, што ў гэтых фотаздымках не было ніякага экстрэмізму. Прэс-фатаграфія — на тое яна і журналісцкая фатаграфія, што адлюстроўвае рэальнасць. Гэта не пастановачныя кадры, не фотамантаж. На фотаздымках адлюстраваны рэальныя падзеі, якія мелі месца.

Сітуацыя з альбомамі Belarus Press Photo — абуральная, і я катэгарычна не згодна з дзеяннямі беларускіх улад..."

НА ЗАМЕТКУ

Табак против вредителей

Белокрылка — враг домашних цветов и тепличных растений. Найти ее нетрудно. Это белая мелкая мошка, которая взлетает, если потревожить листву. Она высасывает из листьев и стеблей все соки и приводит если не к гибели растения, то к потере декоративных свойств и урожая.

Причина ее появления — теплый и сухой воздух. Именно такие условия на ее родине — в сухих районах тропиков. Летом белокрылка может перебраться и в открытый грунт, повреждая множество растений, в первую очередь — огурцы, рододендроны, калину, жимолость...

Зимой дома с нею справиться проще. Кто-то засасывает мошку пылесосом. Другие развешивают в теплице клейкие ленты для мух. А можно использовать обычную табачную пыль. Только перед применением ее надо замочить на два часа в теплой воде. После этого раствором поливают почву и опрыскивают растения. Как и всеми биопрепаратами, таким раствором надо обрабатывать растения 3—4 раза с интервалом 5—7 дней, и вредителям придет конец.

Многолетние исследования показали, что табачная пыль и табачная крошка — отличные удобрения для почвы. Они повышают активность микроорганизмов и улучшают питание растения.

Это удобрение не только повышает урожай плодов, ягод и овощей, но и улучшает их внешний вид, вкус. Табак помогает избавиться от муравьев, тли, медяницы, листовертки, долгоносика, моли... После первого же опрыскивания настоем табака тли становится в 15 раз меньше. Причем такое применение не наносит вреда здоровью человека.

Табачную пыль и крошку просто применять и удобно хранить. Ее можно использовать как в виде раствора для опрыскивания, так и в сухом виде как добавку в почву. Для приготовления раствора 0,5 кг пыли или крошки заливают 10 л воды, настаивают 24 часа, отжимают, процеживают. Разбавляют (1:1) чистой водой и обрабатывают растения. В сухом виде табачные отходы разбрасывают перед весенней и осенней перекопкой почвы.

Хранить табачную пыль можно несколько лет в закрытой емкости. В открытой коробке ее хранить можно не более года.

УСМІХНІЦЕСЯ...

Лекцыя ў калгасе.

Выступоўца доўга і нудна распавядае пра перспектывы асваення космасу, пра моц савецкіх атамных рэактараў, аб гераічным засваенні сібірскіх абшараў. У канцы выступлення прапануе задаваць пытанні, калі нешта незразумела.

Слова бярэ стары дзед: "Ну, космас і ядзерныя рэактары — гэта я разумею. А вось ёсць такая цукерка — "падушачка" завецца. Вось як у гэтую падушачку павідла запіхваюць?"

***

Адзін рабочы спазніўся на працу на 3 хвіліны. Пасадзілі за сабатаж.

Другі рабочы прыйшоў за 3 хвіліны да працоўнага дня. Пасадзілі за шпіянаж.

Трэці рабочы прыйшоў секунда ў секунду. Пасадзілі за антысавецкую агітацыю — насіў японскі гадзіннік.

***

— Ваш банк дае крэдыты пад чэснае слова?

— Без праблем...

— А калі я не вярну?

— Вам будзе сорамна перад Богам, калі паўстанеце перад ім.

— Калі гэта яшчэ будзе...

— Вось калі пятага не вернеце, шостага паўстанеце...

ЦІКАВЫЯ СУСТРЭЧЫ

Сола на трэмбіце

Майстар з пагранічнай вёскі Адэльск на Гродзеншчыне ведае, як павінны гучаць старажытныя інструменты

...Пузаты медны барабан, падобны памерамі на вялізны кацёл, самотна валяўся на гарышчы двухсотгадовага драўлянага касцёла Узнясення Найсвяцейшай Панны Марыі. Біты жыццём і падзёрты мышамі, ён амаль не памятаў, як урачыста і велічна гучаў пад тутэйшымі сутарэннямі, пакуль у Адэльск не прыйшлі бязбожнікі з памкненнем разбурыць усе храмы. Медны ветэран мог бы зусім адправіцца ў пераплаўку ці на сметнік, але яму невымоўна пашанцавала. Аднойчы ён трапіў на вочы народнаму ўмельцу Мар'яну Скрамблевічу. Той прынёс інструмент дахаты, агледзеў з усіх бакоў і вырашыў яго рэстаўраваць. Пару дзён пакляпаў-пачараваў, знайшоў на замену кусок патрэбнай скуры — і вярнуў пузатаму рарытэту жыццё. А галоўнае — голас: глыбокі, гулкі, быццам даўшоў з сівой мінуўшчыны.



Мар'ян Скрамблевіч і яго інструменты.

Бацька ведаў французскую мову і граў на гармоніку

Да вайны Адэльск лічыўся мястэчкам шляхетным: кажуць, было тут 5 касцёлаў, 12 ветракоў, амаль дзве тысячы жыхароў і нават свой герб — з выявай апекуна, Святога Антонія. Што зусім не дзіўна: першыя летапісныя згадкі аб гэтым прыгожым пасяленні адносяцца да 14 стагоддзя. А ўжо ў 1546 годзе польская каралева Бона Сфорца падаравала Адэльску статус горада. Працавітыя, бы пчолы, тутэйшыя жыхары акрамя іншых прывілей атрымалі права пастаўляць прадукты да каралеўскага стала. Потым, праўда, задзьмулі трывожныя вятры — слыннае мястэчка пачало пераходзіць з рук у рукі: ад Прусіі да Расіі, затым зноў да Польшчы — аж да 1939 года, калі сюды прыйшла Чырвоная Армія і зрабіла жыхароў Адэльска грамадзянамі СССР.

Дзіўна было тое, што насельнікі амаль кожнай тутэйшай хаты насуперак нягодам любілі пець і танчыць. Самыя галасістыя хадзілі ў хор пры касцёле і зладжана пелі пад акампанемент аргана. Адэльскіх харыстаў, сярод якіх нават самародак-бас меўся, запрашалі не толькі на навакольныя вяселлі, але і на выступленні па ўсёй Польшчы. Меліся ў мястэчку і свае музыкі. На святы гучалі тут гармонікі, скрыпкі, гітары, флейты, кларнет — хоць аркестр ствараЙ з самавучак! А мясцовы арганіст Антон Галамбеўскі аднойчы паехаў у Вільню на конкурс і здолеў перамагчы там тытулаваных гарадскіх канкурэнтаў. Легенду пра тую знакавую перамогу старажылы Адэльска з гонарам расказваюць цікаўным гасцям мястэчка, якія дабіраюцца ў гэтую пагранічную зону, адкуль суседнюю Польшчу можна ўбачыць праз раку.

Бацькі Мар'яна Антонавіча таксама аказаліся не абдзеленыя талентамі.

— Мой дзед на скрыпцы граў, а бацька на гармоніку, — Мар'ян Антонавіч ахвотна аддаецца ўспамінам. — Ён да вайны на заробкі ў Бельгію ездзіў, на шахты — там вывучыў французскую мову. А мама ў Варшаве працавала, таксама мовы замежныя ведала, добра малявала і танчыла. Я нарадзіўся ўжо пры савецкай уладзе. І таксама палюбіў музыку.

Мы сядзім у Адэльскім цэнтры культуры і народной творчасці, куды творца-самародак запрасіў мяне ў госці. Тут майстру спецыяльна выдзелілі памяшканне пад яго незвычайны музей, кожны экспанат якога зроблены залатымі рукамі творцы.

І тут так цудоўна гучыць аповед.

— Гадоў з 10 стаў я граць на сельскіх вечарынках. Малы яшчэ — а ўжо перабіраю мяхі старэнькага гармоніка суседа, які сам жа і падлатаў, каб той зноўку загучаў. Памятаю, неяк раз пазвалі на Вялікдзень іграць. Усе танчаць, весела, святочна. А потым старэйшыя хлопцы сталі сварыцца-штурхацца, бойка пачалася. Мяне страх узяў — мне ж гадоў 12 было, я і збег праз акно. Дома схаваўся і сяджу. А тут прыходзяць мяне шукаць: дзе гарманіст? Бацька ім адказвае: "Не ведаю, дзе ваш музыка, забралі яго дзеўкі". Потым, калі я падрос, падсабраў грошай і купіў у краме баян свярдлоўскай вытворчасці — хрыпа-а-ты!!! Яшчэ праз год самавучыцель да яго набыў — каб не на слых, а па нотах іграць.

Зялёны баян з перламутравымі клавішамі

У школе Мар'ян з трыма аднадумцамі стварылі свой маленькі аркестрык: балазе, знайшліся па хатах мандаліна, скрыпка, барабан і гармонік. Збіраўся адэльскі квартэт па вечарах, самі складалі тэксты песень, падбіралі мелодыі, ігралі. А яшчэ — малявалі паштоўкі, пісалі паэмы, рабілі фотаздымкі.

— Вось гэтым пасляваенным савецкім фотаапаратам пад назвай "Любитель" фатаграфавалі аднавяскоўцаў і навакольныя пейзажы, — мой суразмоўца дастае з шафы агрэгат накшталт чорнай скрыні з двума аб'ектывамі — сапраўдны рарытэт у век лічбавай фатаграфіі. — А друкавалі здымкі з дапамогай гэтага ж "Любителя", прыстасаваўшы яго пад павелічальнік. Маладыя, пэўна, і не ўсе ведаюць, што раней фатаграфіі трэба было ў цемры ў спецыяльных растворах друкаваць.

Аднак галоўным захапленнем Мар'яна заставалася музыка. І вельмі хацелася мець добры, з прыгожым, чыстым гукам баян!

— Аднойчы іду па Гродне каля рынку, а адтуль даносіцца такі прыгожы разліў! Я бягом на гук, бачу: салдацік іграе. Баян — вачэй не адвесці: зялёны, клавіятура перламутравая, на баку літары нямецкія. Трафейны інструмент. Я ў салдаціка пытаюся: "Колькі просіш?" Тры с паловай тысячы рублёў аддаў — ладныя па тых часах грошы. Дарага, але баян гучны, пявучы, да гэтай пары ў рабочым стане. Вельмі берагу яго! Цяпер сын любіць на ім зайграць.

У арміі хлопец з Адэльска па начах успамінаў сваю вёску — як пелі ветракі побач з бацькоўскай хатай. Мо таму, што служба яму выпала далёка ад роднай Гродзеншчыны, ды і на адным месцы сядзець не давялося — вандраваў па ўсім СССР, суправаджаючы грузы ад Краснаярска да Камсамольска-на-Амуры. Але ж пра музыку і там не забываўся: браў у рукі інструмент, як выпадала.

Вярнуўшыся дамоў з войска, ён зразумеў: трэба сур'ёзна вучыцца музыцы. Курсы баяністаў — гэта добра, але недастаткова. Закончыў завочна музычнае вучылішча, а потым замахнуўся аж на Ленінградскую вышэйшую прафсаюзную школу культуры.

Папрасіў Стравінскага: "Можна я павучуся ў вас працаваць з аркестрам?"

Дзіўныя драўляныя рыбы-акарыны — звычайна іх робяць з керамікі — быццам плывуць у паветры музея. Навацыя майстра — тачыць іх з дрэва, дадаючы інструменту за кошт гэтага поліфанічнасці. Пачаставаўшы мяне яблыкамі з уласнага саду, субяседнік працягвае аповед:

— Мне ўжо за 30 было, калі я стаў ездзіць у Ленінград на сесіі. Спачатку ў інтэрнаце жыў, а потым на кватэру пайшоў. А што рабіць? Хлопцы жаніхаюцца з дзяўчатамі, нанач іх прыводзяць, а мне веды патрэбны. Затое ўсё лепшае ў жыцці пабачыў там. З'езд кампазітараў праходзіў — я на цэлы дзень туды: хочацца ж на Тухманава, Пахмутаву паглядзець. Убачыў іх у зале зблізку — прама як вас цяпер, але загаварыць не наважыўся. А сустрэўшы Стравінскага, не ўтрымаўся, папрасіў: "Я студэнт, хачу паслухаць, як вы працуеце з аркестрам". І ведаеце, ён не адмовіў, дазволіў прыходзіць на рэпетыцыі. Некалькі дзён я да яго хадзіў. Строгі ён быў — жах, але ж музыкі пад яго кіраўніцтвам так працавалі, што маглі песню з першага разу запісаць для радыё. А якія людзі нам лекцыі чыталі! Сябар сям'і Дастаеўскага распавядаў пра рускую літаратуру, дырэктар Эрмітажа — пра гісторыю мастацтва.

Падымаць музычную культуру Беларусі Мар'яну Скрамблевічу давялося спачатку ў звычайнай школе — выкладаў музыку дзецям. Потым не паладзіў з дырэктарам, пераехаў у Гродна, уладкаваўся загадчыкам клуба аўтапарка. Прыйшоў прымаць клубную маёмасць — сэрца ёкнула: ламаны баян, пабіты барабан — вось і ўвесь інструмент.

— А вось калектыў — сапраўдны людскі вір! Аж 1300 чалавек. А колькі спеўных мужчынскіх галасоў! — усміхаецца ён пры ўспамінах.

Гродзенскія вадзіцелі ахвотна выводзілі ў вольны час гучныя і вясёлыя прыпеўкі. Не баючыся аніякай сцэны, нават самай высокай і ганаровай. Аднойчы міністр транспарту БССР пачуў на канцэрце пасля саюзнай нарады, як спяваюць аўтамабілісты з горада на Нёмане. Расчуліўся так, што асабіста распарадзіўся выдзеліць грошы на новыя сцэнічныя касцюмы самадзейным спевакам.

Пра што трубіць рог Міцкевіча?

Вось вы ведаеце, як выглядае трэмбіта? А жалейка? А трашчотка? А рог Міцкевіча?

Я ўжо ведаю, таму што пабачыла рукатворныя шэдэўры Мар'яна Скрамблевіча на свае вочы. У яго музеі 120 розных копій старадаўніх музычных інструментаў. Дзеючых! Магло быць значна больш, але ж работы майстра раз'ехаліся па Расіі, Канадзе, Польшчы, Францыі, адкуль іх заказваюць тыя знаўцы-эстэты, ад кампазітараў да выканаўцаў, што маюць патрэбу ў штучных музычных прыладах.

— А як прыйшла ў галаву ідэя майстраваць дакладныя копіі старадаўніх інструментаў? — пытаюся ў адэльскага самародка.

— Я ўсё жыццё шмат часопісаў выпісваў. З нотамі, са схемамі ўсялякіх музычных цікавостак. А як пачалася перабудова, што супала з маёй пенсіяй, вырашыў паспрабаваць сам выточыць дудачку. Хлопцы з завода дапамаглі змайстраваць адмысловы такарны станочак. З першага разу не атрымалася мая дудка, а потым справа пайшла. І людзі сталі дапамагаць: то паваленае бурай дрэва з дачы аддадуць, то бамбук падораць, то падкажуць, дзе чароту шмат. З чароту выдатныя дудачкі выходзяць. Праўда, добры чарот далёка расце — на рацэ Свіслач. І нарыхтоўваць яго лепш зімой. Паехаў я нядаўна за ім і пад лёд праваліўся, але ж паспеў добры запас нарэзаць. А нядаўна я скрыпку старадаўнюю адрэстаўраваў. Знаёмыя слесары з Гродна на сметніку яе знайшлі, аддалі мне. Стаў яе аглядаць, павярнуў на сонца — а там выразаная дата блішчыць. Скрыпачцы, аказваецца, як і барабану з касцёла, больш за 300 гадоў.

— І што, любому старадаўняму інструменту можаце даць адпаведны голас? — я ківаю галавой на шматлікія экспанаты на сценах.

— Хоць жалейкі, хоць рог Міцкевіча магу выточыць — і ўсе абавязкова гучаць. На кожным жа сам граю. Хочаце паслухаць? З якога пачнём? — Майстар бярэ па чарзе свае штуковіны з паліц — і музейны пакой запаўняецца залівістым птушыным пошчакам. Тут табе і салавей, і малінаўка, і кнігаўка. Хвіліна цішыні — і птушыны гоман змяняецца выццём ваўка, рохканнем дзіка, залівістым брэхам хартоў. А над усім гэтым лясным рознагалоссем — працяжны кліч паляўнічага рога.

— А адкуль ведаеце, што ў Міцкевіча быў менавіта такі рог, як вы зрабілі? — я таксама бяру ў рукі пачарнелы інструмент.

— Ну, можа, і не зусім такі. Але я ў старадаўняй польскай ілюстрацыі паэмы "Пан Тадэвуш" падгледзеў. І з сасны выразаў: падсмаліў драўніну да патрэбнага колеру, каб састарэлай выглядала.

— А праўда, што ў музычных інструментаў павінна быць душа? — пытаюся напрыканцы сустрэчы.

— Душа ў кожнага павінна быць, — адказвае творца. — І ў першую чаргу у самога майстра. Не падзелішся ёю з дрэвам, не ўкладзеш часцінку — не будзе музыкі. А яшчэ калі дуду ці жалейку пакрыўдзіць, яны таксама могуць змоўкнуць. У мяне адна акарына так пакрыўдзілася і страціла голас. Без душы не бывае музыкі.

Парыўшыся на паліцы, Скрамблевіч дастае дзве далікатныя дудачкі з чароту:

— Вось, вазьміце на памяць — тут таксама кавалачак маёй душы.

Людміла СЯЛІЦКАЯ.
Фота аўтара.

P.S. Але ж не давала мне спакою адна загадка-здагадка. Вельмі ўжо незвычайнай формы быў той барабан, што знайшоў майстар у касцёле! Ну чаму такі пузаты, як кацёл з феадальнай кухні?

Я патэлефанавала Скрамблевічу — распытаць яшчэ больш пра дзіўны бубен ды падзяліцца сваёй гіпотэзай. А заадно распытаць пра здароўе ды навіны.

"Заканчваю дуду, за якую ўзяўся. А яшчэ мне паведамілі, што мае інструменты ўвайшлі ў нацыянальны здабытак рэспублікі, а мне прысвоілі званне народнага майстра. Праўда, пасведчанне яшчэ не ўручылі", — далажыў Мар'ян Антонавіч.

Я павіншавала майстра з заслужанай узнагародай. А потым запыталася:

— А вы ведаеце, што той ваш медны барабан-бубен з касцёла вельмі падобны на літаўры?

— Я і сам часам называю яго літаўрамі. Ведаю са слоў старажылаў, што падчас службы гэты інструмент выкарыстоўвалі замест касцельных званоў. Падчас урачыстасцяў.

Вось як!

Цікава, якое меркаванне на гэты конт у спецыялістаў-экспертаў?

ШАХМАТЫ

Задача-лауреат
А.Плостак

Белые: Kpf2, Фh7, Лd1, Лg4, Cb8, Cg8, Ka1, Kf5, п. d2 (9).
Черные: Kpd3, Cf4, Kb6, пп. A4, g5 (5).
Мат в 2 хода.

Предлагаем вниманию читателей двухходовую задачу белорусского проблемиста Аркадия Плостака, которая была отмечена первым призом на республиканском конкурсе. Попробуйте найти ее решение. Свои ответы присылайте в редакцию.



С Анандом встретится Карлсен

В Лондоне прошел турнир претендентов на звание чемпиона мира по шахматам. В нем выступили восемь сильнейших гроссмейстеров. Турнир проводился по круговой системе в два круга. Со старта лидерство захватили фавориты мирового рейтинга норвежец Магнус Карлсен и гроссмейстер из Армении Левон Аронян. После первого круга они уверенно возглавляли турнирную таблицу, набрав по 5 очков из 7 возможных, намного опережая конкурентов. Но второй круг прошел совсем по другому сценарию. Возмутителем спокойствия выступил россиянин, экс-чемпион мира Владимир Крамник, одержавший четыре победы. А Аронян и Карлсен играли не столь удачно. В итоге за два тура до финиша лидировал Крамник, а Карлсен отставал на пол-очка.

Финиш выдался захватывающим. В предпоследнем туре Крамник завершил вничью поединок с Борисом Гельфандом (Израиль), а Карлсен в трудном эндшпиле переиграл Теймура Раджабова (Азербайджан). Перед заключительным туром соперники вновь сравнялись, но им приходилось учитывать, что при дележе победителем становился норвежец. В нервной обстановке последнего тура оба претендента потерпели сенсационное поражение. Карлсен проиграл россиянину Петру Свидлеру, а Крамник вынужден был сдаться украинцу Василию Иванчуку. В итоге право сыграть в 2014 году матч за шахматную корону с чемпионом мира Вишванатаном Анандом получил Магнус Карлсен. Победителю турнира лишь в конце ноября исполнилось 22 года. В прошлом году он сумел побить рейтинговый рекорд Гарри Каспарова, установленный еще в 1999 году — 2851, доведя его до отметки 2872!

Окончательные итоги турнира в Лондоне: 1.Магнус Карлсен — 8,5 из 14, 2.Владимир Крамник — 8,5, 3.Петр Свидлер — 8, 4.Левон Аронян — 8, 5.Борис Гельфанд — 6,5, 6.Александр Грищук (Россия) — 6,5, 7.Василий Иванчук — 6, 8.Теймур Раджабов — 4 очка.

ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ, ЧТО...

Серьги в ушах — статус вечного рабства

Серьги сейчас носят и женщины, и мужчины; и старые, и молодые, и дети... Хотя, создавая человека, Бог не создал уши со специально предназначенными для этой цели дырками. Значит, в этом украшении должен быть какой-то особый смысл.

Издревле проколотое ухо было символом вечного рабства. Священное Писание повествует о том, что в случае, если раб не проявлял желания выйти на свободу в седьмой год, его через определенную процедуру делали вечным рабом, а именно — подводили к косяку дверей и шилом прокалывали уши.

Получается, что, прокалывая уши, мы, сами того не ведая, причисляем себя к рабам.

Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а. Прыёмная: тэл. (017) 3286871. Тэл./факс рэкламнага аддзела: (017) 3286904, 3286906
nv@promedia.by
http://www.nv-online.info http://twitter.com/narodnaya_volya

ISSN 2071-9647

9 772071 964000 13030

Падпісныя індэксы: 63222, 632222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 15.04.2013 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 27470 экз. Заказ №1538.